№ 1 (63)/2008

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК – ВАРШАВА, студзень-чэрвень 2008 г.



(Фота: http://serebranka.sdb.by/2/index.php)

*1. Сьветлы дзень і сьветлы час. Менск. Першая Сьвятая Камунія ў Беларускім касьцёле ў Серабранцы*

# РЭЖЫМ АБВЯСЬЦІЎ „ВЫБАРЫ”

24 чэрвеня рэжым абвесьціў пра пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у сваю палату.

Прапануем зьвярнуць увагу, што ў той жа дзень, 24 чэрвеня, А.Лукашэнка сустракаўся з дырэктарам ФСБ Расеі А.Бортнікавым. З інфармацыі выданьня Interfax.by выглядае так, што А. Лукашэнка даў справаздачу вышэйшаму начальніку пра яго дамоўленасьці з прэзыдэнтам Расеі Мядзьведзевым наконт рэалізацыі „саюзнай дзяржавы” і выказаў падзяку „за ту поддержку, которую оказывает ваше ведомство нашей стране”. А. Бортнікаў паабяцаў Лукашэнку і надалей аказваць дапамогу: „глава ФСБ России заявил о том, что в ходе совместной коллегии ФСБ РФ и КГБ Беларуси будет обсужден ряд проблем, а также „необходимость укрепления взаимодействия”. „Мы знаем, угрозообразующие факторы и с учетом этого будем планировать совместную работу. В частности, уточнил он, на совместной коллегии будут в комплексе рассмотрены вопросы обеспечения безопасности двух государств”. Паняцьце: – „обеспечение безопасности двух государств” – у крэмлёўскага і лукашэнкаўскага рэжымаў адно – гэта захаваньне іх улады і нарабаваных багацьцяў..

Рэжымы будуць арганізоўваць сумесна імітацыю „легітымных выбараў ў палату”. На гэта цяпер працуюць, як бачым, рэжымная вертыкаль, спэцслужбы, дыпляматы, падкантрольная псэўдаапазыцыя. І Маскве, і рэжыму ў Беларусі патрэбная цяпер „легітымная палата” ( дакладней, бачнасьць легітымнасьці, прызнаная Захадам), дзеля фармальнай „законнасьці” ў правядзеньні маніпуляцыяў зь беларускай маёмасьцю.

Ня без удзелу і ўплыву расейскага рэжыму і яго мінісэрства замежных справаў супраць байкоту лукашэнкаўскіх выбараў выступілі чыноўнікі Парляманцкай Асамблеі Рады Эўропы, чыноўнікі Арганізацыі Бяспекі Савета Эўропы, чыноўнікі Эўразьвязу. Такім чынам і эўрапейскія чыноўнікі пагадзілася спрыяць брутальна фальшывым выбарам. Фактычна, пагадзіліся на акупацыю Беларусі Расеяй.

Народ Беларусі мае магчымасьць перакуліць гэтыя пляны. Трэба масава не пайсьці на абвешчаныя на верасень „выбары”. Раім усім патрыётам Бацькаўшчыны, сумленным і занепакоеным уласным лёсам, лёсам сваіх дзяцей і ўнукаў, зрабіць так, як прапануецца ў звароце, які друкуецца тут.

# ДА ГРАМАДЗЯНАЎ БЕЛАРУСІ!

На верасень 2008 г. рэжым рыхтуе „выбары” сваёй палаты. Ёсьць рэальная небясьпека, што **пад „выбары” рэжым можа падсунуць рэфэрэндум па канстытуцыйным акце незаконнай „саюзнай дзяржавы з Расеяй”. Або праз нібыта „легітымную” палату зацьвердзяць незаконнае ўтварэньне – „саюзную дзяржаву”.** Беларусы мусяць адвярнуцца ад рэжыму, ня ўдзельнічаць у фальшывым галасаваньні. Калі беларусы не адвернуцца, ня выстаяць супраць падманнага і прымусовага зацягваньня іх на выбарчыя ўчасткі, то з усімі намі можа здарыцца вялікае няшчасьце. Прадажны рэжым можа выкарыстаць магчымасьць, каб зьнішчыць нашу незалежнасьць, ператворыць Беларусь у губернію расейскай імпэрыі, а нашых хлопцаў (можам не сумнявацца) пагоняць гінуць у „гарачыя кропкі” вечна ваюючай Масковіі.

КАЛІ МЫ НЯ БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА, – БЕЛАРУСКУЮ МАЁМАСЬЦЬ, ЗЯМЛЮ ЗАГРАБУЦЬ ДА РУК МАФІЙНЫЯ МАСКОЎСКІЯ КЛАНЫ.

Мы ўжо цяпер бачым вынікі распродажу Беларусі прамаскоўскім рэжымам Лукашэнкі пад расейскія так званыя „стабілізацыйныя” крэдыты. Закладзены пад гэта прыбытковыя беларускія прадпрыемствы нафта-хімічнага комплексу, Белтрансгаз, Жодзінскі „Белаз”, Менскі МАЗ, прадпрыемствы энэргетыкі, банкі ды іншыя. Ужо сёньня вялікія зямельныя ўчасткі нашай сталіцы аддадзены маскоўскай мільярдэрцы Батурынай (жонцы маскоўскага мэра Лужкова) пад будаўніцтва жыльля, якое будзе не па кішэні беларусам. Купляць будуць расейскія крымінальнікі, якія панаедуць з крымінальнымі капіталамі, каб прыгнятаць і абдзіраць наш народ. Яны ўжо плянуюць пабудаваць дзясяткі казіно ды іншых „забаўляльных установаў” у нашым Менску: расейскія крымінальнікі будуць забаўляцца ў нас. Дабра нашым людзям гэтая палітыка рэжыму „любові да Расеі” не прынясе.

Журналістка Сьвятлана Калінкіна ў газэце „Народная Воля” за 19 чэрвеня 2008 г. у артыкуле „Богатейшие люди России атакуют белорусский рынок” піша пра тое, як актыўна крамлёўскія алігархі разьмяркоўваюць паміж сабою сфэры беларускай прамысловасьці і эканомікі. Відавочна, што забор ( а не продаж) прадпрыемстваў алігархі плянуюць правесьці па маскоўскіх крымінальных карупцыйных схэмах. Вось высновы С. Калінкінай: *„ А. Лукашенко много лет рассказывал, что не позволил российским олигархам скупить Беларусь. А теперь вдруг затих, больше не хвастается. Наоборот, не проходит недели, чтобы не стало известно о том, что готовится продажа того или иного белорусского предприятия... Бастион пал.”*

Зацьвердзіць вынікі распродажу Беларусі, прыдаць яму выгляд законнасьці, па задумцы Лукашэнкі і яго атачэньня, павінна новая „палата прадстаўнікоў” (у якую могуць спэцыяльна прапусьціць пару чырвоных псэўдаапазыцыянераў). Людзі ведаюць, што сьпіс „дэпутатаў палаты”, якіх яны павінны „выбраць”, яшчэ да „выбараў” зацьвярджае А.Лукашэнка. Народ жа патрэбны для масоўкі.

У падмане людзей рэжыму дапамагае групоўка асобаў, якая называе сябе „дэмакратычнай апазыцыяй” (С.Калякін, А.Лябедзька, В.Вячорка, А.Мілінкевіч, М.Статкевіч ды іншыя). Перад імі пастаўлена задача іхнымі грантадаўцамі – прыцягнуць на „выбарчыя ўчасткі” як мага больш людзей, а галоўнае – пратэстную частку беларускага грамадзтва. Гэта дапаможа рэжыму ў справе прызнаньня вынікаў „выбараў” Захадам. Тут бізнэс падстаўной апазыцыі. Даўно вядома як гэтым „дзеячам” аплочваюць ганебную справу. Для дэманстрацыі заходнім назіральнікам легітымнасьці „выбараў” рэжыму трэба, каб на выбарчыя участкі людзі прышлі галасаваць, астатняе ўсё будзе зроблена фальсіфікацыйнай машынай улады. Вопыт засьведчыў, што беларускі выбаршчык, галасуючы, не ў стане ўплываць на вынікі галасаваньня, якія прадвызначаныя зьверху.

Прыстойны чалавек ніколі ня будзе ўдзельнічаць ў ашуканстве і не дазволіць сябе ашукаць. Так і нам, беларусам, трэба адвярнуцца ад рэжыма, ня ўдзельнічаць і не спрыяць фальсіфікацыям і ашуканству. Той, хто ня пойдзе да ашуканцаў і фальсіфікатараў, пасля так званых „выбараў” будзе пачуваць сябе годна.

Калі масава людзі ня пойдуць на ўчасткі, гэта і будзе рэальным і неабходным ударам па рэжыму.. Няхай рэжым фальсіфікуе як хоча. Але вынікам будзе тое, што народ не прызнаў рэжым і ягоныя „выбары”. У гэтым ёсьць добры грунт для наступнай перамогі. Ды і расейская хэўра будзе ведаць, што беларусы ня прымуць афёру пад шыльдай „саюзнай дзяржавы” і здольныя абараніць сваю краіну ад маскоўскай крымінальшчыны.

Паважаныя беларусы! Да даты фальшывых „выбараў” неабходна правесьці тлумачальную працу пра няўдзел ў фальшывым галасаваньні, пра тое, што трэба адмовіцца ад рэжыму і ня йсьці на „выбарчыя ўчасткі”. Кожны, хто атрымае гэты ліст, і іншыя нашы матэрыялы, можа растлумачыць сваім блізкім, суседзям, супрацоўнікам, знаёмым, чаму ня трэба ісьці на падманныя „выбары”. І наша справа будзе рухацца.

Яшчэ да „выбараў” ганіце ад сябе і высьмейвайце розных зазывалаў на „выбары”. Ганіце ад сябе абяцальшчыкаў ад рэжыму, прадажных „псэўдаапазыцыянераў” і тых, каторыя будуць называць сябе „незалежнымі”. Паказвайце ўсім іхнюю меркантыльную, здрадніцкую пазыцыю.

Не паддавайцеся на запалохваньні, што вас выселяць зь інтэрнату, звольняць з працы, выключаць з навучальнай установы. Мільёны людзей ня звольняць. Трэба змагацца. Будзьма мудрэйшымі, шукайма мэтады, каб абыйсьці рэжымныя „рагаціны”. Памятайма, што будзе непараўнальна горш, калі прыдуць расейскія алігархі, паставяць сваю адміністрацыю, якая ўчыніць масавыя звальненьні, а ў якасьці кампэнсацыі прапануюць рабскую працу ў Расеі.

**Нашыя справы мы, беларусы, мусім рабіць самы. Ніхто за нас рабіць ня будзе. Гэта наша дзяржава, наша зямля, наша маёмасьць, наша мова і культура і наша права.**

***МЫ МУСІМ СТАЦЬ ГАСПАДАРАМІ Ў СВАІМ ДОМЕ*.**

*Чэрвень 2008 г.* ***„Беларуская Салідарнасьць”.***

*Ініцыятыва ў падтрымку пазыцыі*

*Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*

Удзячныя тым, хто памножыць і распаўсюдзіць гэтую тэкстоўку.




**2. Паралельны сьвет альбо «русские прошли».** *Вось што пакінулі пасьля сябе некалькі сотняў расейскіх (ці няхай сабе – „прарасейскіх") аматараў футбола, што глядзелі матч „Расея – Іспанія" ля тэлеэкрана на Цэнтральнай плошчы Менска. Такога ў Менску не было за ўсю дакумэнтаваную гісторыю горада. Гэты здымак фотажурналісткі Юліі Дарашкевіч (http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=18037) успрымаецца як сымвал брыдоты і ўсяго таго што навалілася і адбываецца цяпер у Беларусі.*

# УЛАДА ЦЕМРЫ

У гэтым лісьце я пазначу некалькі тэмаў, істотных для нашай пазыцыі і палітычнае барацьбы.

Мы бачым, што антыбеларуская палітыка і перасьлед усяго беларускага ўзмацняюцца. Краінай ужо амаль 14 гадоў кіруе чужая агрэсіўная цемра. Мы бачым таксама паэтапны плян вынішчэньня асноваў культурнага існаваньня Беларускай нацыі. Гэты плян выконваецца мэтанакіравана і пасьлядоўна. Парадак, сэнс і зьмест яго выкананьня вышэйшы за інтэлектуальныя магчымасьці чалавека, у руках якога апынулася ўся ўлада ў Беларусі. Тым часам якраз ён зьяўляецца пасьлядоўным і адэкватным яго выканаўцам. Антыбеларуская фобія знайшла адпаведную парадыгму палітыкі, распрацаваную ў лубянскай Маскве.

Для фобіі няма нічога сьвятога і ніякіх табу, усё дазволена. Характэрная мадэль паводзінаў у стане фобіі – зьдзек і кашчунства, абплёўваньне вялікага, блюзьнерства над сьвятым. Фобія, як правіла, спадарожнічае паранойі і псіхапатыі. Усімі гэтымі рысамі ад самага пачатку характарызуецца палітыка антыбеларускага рэжыму на Беларусі (парваньне Беларускага Сьцяга, спаленьне беларускіх падручнікаў, зьдзек і зьнявага Беларускай мовы, ліквідацыя беларускіх школаў, гімназіяў і ліцэяў, абплёўваньне імя Васіля Быкава, блюзьнерства над Францыскам Скарынай і вялікімі людзьмі Беларускай нацыі, разбурэньне і пераробка знакавых помнікаў гісторыі і культуры, мэтанакіраванае псаваньне нацыянальнага краявіду і вынішчэньне запаведнай прыроды, грэблівыя адносіны да беларускіх людзей, беларускай творчасьці і літаратуры, нянавісьць да маладых і да вольнага чалавека.

Гэта цягнецца ўжо з году ў год, ганебна і прыніжальна для асобы, для культурнай нацыі. Усё гэта – характэрныя праявы рэжыму ўнутранай акупацыі. Беларусы сталіся закладнікамі чужой палітыкі. Псіхалёгія закладнікаў дакладна праглядаецца ў нашым нацыянальным становішчы. Асноўная маса людзей, паралізаваная страхам, маўчыць. Частка супрацоўнічае з „тэрарыстамі" і хваліць бандзюг. Асобныя людзі паўстаюць супраць гвалтаўнікоў і гінуць; нязгодныя церпяць рэпрэсіі і перасьлед, які набывае пачварныя формы.

Культывуецца злачынная сталінская ідэалёгія, аднаўляюцца разбуральныя мэтады сталінізма. Як і пры сталінізме, за часы савецкай акупацыі ў 30-х гадах, антыбеларускі рэжым, які ня ведае і не карыстаецца беларускай мовай, прыдумаў рэпрэсіўны правапіс беларускай мовы як мэтад яе масавага вынішчэньня.

За напісаньне, нязгоднае з гэтым прыдуманым правапісам, і за артаграфічныя памылкі (прытым ва ўсіх сфэрах жыцьця) кожнага беларускага грамадзяніна і людзей без грамадзянства будуць караць штрафам, выганяць з працы і вучобы, ужываць іншыя мэтады пакараньня (як плянуюць некаторыя ненавісьнікі Беларусі, аж да пасадкі ў турму).

Мэта гэтага шызафрэнічнага закону – легальным чынам забараніць беларускую мову. Страх перад штрафам, перад стратай працы, вучобы, перад іншым пакараньнем павінна, па паранойнай лёгіцы беларусафобнага „заканадаўства", адбіць жаданьне ў людзей пісаць па-беларуску, здаваць экзамены і нават пісаць лісты (ня кажам ужо пра газэты і кнігі) на беларускай мове. Усё скіравана на тое, каб беларусы сталі пісаць толькі па-расейску.

Чужая руская мова, якую антыбеларускі рэжым зрабіў сваёй „дзяржаўнай", гэтаму закону не падлягае. Пішы, маўляў, хоць „харашо", хоць „жэстачайшэ плоха" – „сайдзёт". „Закон" цынічна дыскрымінацыйны да беларусаў. Тут груба парушана ўсё, што магчыма было парушыць: Канстытуцыя, міжнародныя законы і правы, правы асобы, лёгіка, маральнасьць і здаровы сэнс. Характэрна, што ніхто ня ведае, што гэта за „правапіс", не было ніякага грамадзкага азнаямленьня (тым больш, абмеркаваньня). Невядома нават, хто ягоныя псэўдана-

вуковыя рэцэнзенты. Здаецца, ніхто зь іх яшчэ не аб'явіўся (не падпісаў сабе нацыянальны вырак), а „закон" падрыхтавалі ўжо да прыняцьця ў апошнім чытаньні.

Тут нават не настолькі ўражвае і абурае дзікунства такога „закону", колькі той грубы, прымітыўны і выраблены цынізм, зь якім адбываецца вынішчэньне беларускай мовы. ***Ліквідацыя беларускай мовы ёсьць (і быў заўсёды) галоўны пункт маскоўскай акупацыйнай палітыкі на Беларусі.***

Цынізм, фобія, жорсткасьць, блюзьнерства, зьдзек і хлусьня – тыповыя дачыненьні ў адносінах акупацыйных уладаў зь беларускім насельніцтвам. Абдзіраюць нават бедных і няшчасных, карыстаюцца з гора й бяды. Увялі ў практыку, напрыклад, браць грошы з пагарэльцаў як аплату за тушэньне пажару. З пункту гледжаньня права, тут грубае парушэньне, бо пажарная служба – гэта дзяржаўная справа. Яна ўтрымліваецца і дзейнічае за кошт падаткаў, якія плаціць у бюджэт кожны беларус (і кожны патэнцыйны пагарэлец). Браньне грошай зь няшчаснага пагарэльца (ды яшчэ праз пракуратуру і суды) – гэта ёсьць антыпраўнае вымагальніцтва рэжыму з выкарыстаньнем службовага становішча. З пункту гледжаньня нашай беларускай, традыцыйнай, праверанай стагоддзямі маралі аб талацэ, спачуваньні і абавязковай дапамозе пагарэльцам, такія паводзіны рэжымных функцыянераў мафіёзнай улады ёсьць хамскі, злосны зьдзек з няшчасных, кашчунства над традыцыяй, абылганьне здаровага сэнсу.

Такія ж ілжывыя, цынічныя, хамскія і вымагальніцкія адносіны да беларускай змагарнай моладзі, да беларускіх дробных гандляроў і індывідуальных прадпрыймальнікаў, да вернікаў нерэжымнай (г. зн. неправаслаўнай) рэлігіі, да чарнобыльцаў, ліквідатараў, беларускіх музыкаў, мастакоў і г.д.

У такіх умовах і пры чужой антынароднай уладзе вельмі істотна, каб у грамадзтве захаваліся ідэалы, традыцыі ў душы; добрае, чыстае, сьветлае, беларускае і сваё – ў сэрцы і дачыненьнях паміж сабой. Гэта ня дазволіць зьмірыцца з цемрай, прывядзе да змаганьня, да вольнага зьместу жыцьця.


(Фота Ю. Дарашкевіч)

*3. Пакаленьне рэжыму.*

***Цемрашальства антыбеларускага рэжыму асабліва выразна відаць у выбарах.*** Практычна, усе выбары за гэтым рэжымам былі недэмакратычнымі і былі сфальсіфікаваныя. У фальсіфікацыі незаконных выбараў прэзыдэнта ў 2006 годзе публічна прызнаўся сам фальсіфікатар А. Лукашэнка. Зразумела, што ён не хацеў гэта сказаць. Але яго падвялі дрэннае веданьне законаў, прымітывізм лёгікі і жаданьне быць арыгінальным. У выніку ён „прызнаўся" перад журналістамі, што „ва ўгоду Захаду" зьменшыў лічбу працэнтаў выбаршчыкаў, якія нібыта „прагаласавалі" за яго (бо, маўляў, надта шмат было). Небарака, відаць, думаў, што калі ён скажа пра зьмяншэньне адсоткаў не ў сваю карысьць, то гэта ня будзе выглядаць фальсіфікацыяй і ня выявіць ягонага незаконнага ўмяшальніцтва ў падлік галасоў і ўплыву на канцовы вынік галасаваньня. Фальсіфікацыйная машына падліку бюлетэняў тут адладжаная і простая, як кій. Пры адсутнасьці рэальнага кантролю над галасаваньнем і пры рэжымнай аднароднасьці выбарчых камісіяў галасы лічаць, як хочуць, але канцовы вынік падліку пішацца якраз у вертыкалі выканаўчай рэжымнай улады. (Якраз у гэтым па прастаце разумовай і прызнаўся А. Лукашэнка перад журналістамі ў лістападзе 2006 года.)

Заканадаўства аб выбарах, якое існуе, – далёкае ад дэмакратычных нормаў (і, зрэшты, ад Канстытуцыі). Яно дае магчымасьць правядзеньня галасаваньня цягам некалькіх дзён (так званае „папярэдняе галасаваньне"), што стварае ўмовы для маніпуляцыяў выбарчымі бюлетэнямі і для адміністрацыйнага ціску на выбаршчыкаў (іх, фактычна, прымушаюць браць удзел у галасаваньні, часам нават прывозяць на ўчасткі).

Практыкуюцца таксама падказкі, ціск, хаджэньне прадстаўнікоў выбарчай камісіі са скрынкамі для галасаваньня па дамах выбаршчыкаў і іншыя яшчэ сталінскія прыёмчыкі.

Маючы ўвесь гэты квазізаконны сурагат выбарчай сістэмы, трэба ўлічыць яшчэ вельмі істотнае: парляманту як законнай, легітымнай і незалежнай галіны заканадаўчай улады ў Беларусі не існуе. Гэта прыдатак аўтарытарнай улады без самастойных правоў і магчымасьцяў. „Палатку" (так у народзе называюць гэты ворган) кіраўнік рэжыму можа нібыта законна (па рэжымным законе) ліквідаваць зь любой нагоды і набраць іншы камплект – была б прычына і патрэба.

Для правядзеньня фальсіфікацыйных выбараў у гэтай сітуацыі і для стварэньня бачнасьці справядлівага галасаваньня і дэмакратычнага выбарчага працэсу рэжым мусіць забясьпечыць найперш два аспэкты дзеяньня: удзел розных палітычных арганізацыяў (пажадана „апазыцыйных") у бяссэнсавых для іх выбарах і другое – вялікі (пажадана масавы) удзел выбаршчыкаў у галасаваньні. Тады фальсіфікацыя выглядае „элегантнай перамогай" з большай паловай усіх выбаршчыкаў „за" (а не якіх-небудзь 30 адсоткаў пры малой „фрэквэнцыі"). Хаця і тут „машына" навучана „накідаць".

Для такога роду выбарчых камэдыяў рэжым стварае свае „апазыцыйныя" арганізацыі, знаходзіць падстаўных асобаў, якія заклікаюць усіх пайсьці на выбары ды сказаць рэжыму сваё цьвёрдае „нет!" і г.д.

У Беларусі гэтакая гэбоўская схема адпрацавана даўно, нудна і жмудна, аж да стэрэатыпаў, з разьмеркаваньнем роляў, саліста́ў і вызначэньнем паводзінаў.

У апошні час, з умацаваньнем гэбізму і карпаратыўнай дыктатуры ў Расеі, лукашысцкі „вопыт" выбараў пачала пераймаць лубянская Масква. Сістэма гэбоўскага выбарчага ашуканства ў Беларусі ўжо закасьцянела і сфармавалася настолькі маналітна, што разбурыць яе можна, відаць, толькі разам з антыбеларускім рэжымам.

***У гэтых умовах удзельнічаць у так званых парляманцкіх выбарах на Беларусі, што прызначаны ўжо на верасень, ня толькі бяссэнсава, але найперш шкодна. Гэта, фактычна, падыгрываць рэжыму ў ашуканстве людзей.*** Беларускі Народны Фронт і яго народная Партыя (КХП-БНФ) не павінны ўдзельнічаць у такіх „выбарах".

Зразумела, таксама, што наяўнасьць падстаўной „апазыцыі" забясьпечыць фармальны ўдзел фармальна „апазыцыйных" партыяў у рэжымных выбарах. Яны будуць ствараць фармальную бачнасьць дэмакратычнага працэсу, як Гайдукевіч – фармальную альтэрнатыву Лукашэнку. Такая іхная роля, і ніякія




*4. Трэці тэрмін: „Президентские выборы завершились убедительной победой Лукашенко" («Советская Белоруссия»).*

доказы, угаворы, лісты, ськіваваныя да гэтае публікі, ня маюць сэнсу. (Мы ўсё гэта перажылі.)

Тым часам вялікай „масавасьці" галасаваньня цяперашняя падстаўная „апазыцыя" ня зробіць (хоць і паспрые). „Масавасьць" звычайна стварае найперш сам рэжым. І тут трэба супрацьдзейнічаць выбарчаму ашуканству, заклікаць беларусаў ня йсьці на галасаваньне, байкатаваць фальсіфікацыю і недэмакратычныя выбары, тлумачыць людзям, чаму гэта неабходна рабіць, чаму трэба пакінуць рэжым гуляць самога з сабой і не падтрымліваць парушэньне закону і нішчэньне правоў народу Беларусі, памятаючы, што маральная перамога ёсьць вялікая перамога і шлях пераменаў.

*9 сакавіка 2008 г.* **Зянон ПАЗЬНЯК**

***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

# ШУКАЮЦЬ АХВОТНЫХ ПАДЗАРАБІЦЬ НА ПРОДАЖУ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

***(Чэрвеньскі Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ)***

8 чэрвеня сёлета ў Менску адбыўся чарговы Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Быў заслуханы даклад сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца на Беларусі абавязкаў старшыні Фронту і Партыі, і сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі.

Падстаўная апазыцыя пачала актыўна рабіць заявы пра неабходнасьць „актыўнага ўдзелу ў маючых адбыцца сёлета выбарах". Гэтым разам гэтыя дзеячы не насьмеліліся заклікаць людзей „ісьці і сказаць сваё НЕ рэжыму". Яны не рашыліся паўтараць яшчэ раз ужо паўтораны падман. Цяпер яны высунулі дэмагагічны і пусты лёзунг аб „неабходнасьці народнага кантролю за выбарамі". ***Згаданы „кантроль" – гэта той жа самы заклік да людзей ісьці на выбарчыя ўчасткі дыктатуры і ўдзельнічаць у фальшывым шоў, дзе ўсё ўжо вызначана заранёў.*** Трэба прызнаць, што гэтым разам адчуваецца няўпэўненасьць псэўдаапазыцыі. Яе дзеячы хвалююцца, бо ведаюць, што гэта можа быць апошняй іхняй магчымасьцю зарабіць грошы на падмане беларусаў. Пасьля выбарчага шоў гаспадары-спонсары проста могуць выкінуць іх на палітычны сьметнік як адпрацаваны матэр'ял. Не выпадкова слова „байкот" раптам выкарысталі некаторыя з засьведчаных актывістаў псэўдаапазыцыі: напрыклад, сумнавядомая „Хартыя-97". Іхняя задача, як выглядае, – яшчэ больш заблытаць і дэзарганізаваць людзей. Непасрэдна перад пачаткам выбарчага шоў яны, безумоўна, патлумачаць, што значыць па-іхнаму „байкот" – „трэба пайсьці на выбарчыя ўчасткі і зарэгістравацца…" Сумленным людзям неабходна раскрываць сапраўдныя пляны і сутнасьць дзейнасьці гэтай публікі.

На цяперашнім этапе вельмі актывізавалася так званая „прыватызацыя беларускіх прадпрыемстваў". На самай справе да прыватызацыі гэтыя падзеі беларускага эканамічнага жыцьця ня маюць ніякага дачыненьня. Тое, што адбываецца, – гэта бандыцкае разрабаваньне маёмасьці, якая належыць беларускаму народу, кожнаму грамадзяніну Беларусі. ***Акцыі скупляюцца мафійнымі структурамі з суседняй Расеі.*** У палітычным напрамку працягваецца далейшая распрацоўка канчатковай „інтэграцыі" (на самай справе – „акупацыі") Беларусі імпэрыялістычнай Расеяй. Пры чым, цяпер гэта робіцца схавана, сакрэтна, паводле злачынных правілаў сакрэтнай антынароднай дыпляматыі. На міжнароднай арэне і на хвалях афіцыйнай прапаганды Масква і падпарадкаваны ёй рэжым РБ заяўляюць, што яны „занятыя цяпер больш важнымі справамі і не сьпяшаюцца з завяршэньнем інтэграцыі". Гэта ёсьць падступная імпэрская палітыка, знаёмыя прыёмы, якімі шырака карысталіся Гітлер і Сталін. Наш народ павінен быць гатовым да абароны незалежнасьці Беларусі. Трэба даносіць праўду пра гэтыя працэсы да грамадзтваў і кіраўніцтва дэмакратычных краінаў.

Выступілі таксама сябры Сойму з розных рэгіёнаў Беларусі. Яны паведамілі пра актывізацыю псэўдаапазыцыйных дзеячаў па ўсёй краіне. Падстаўныя ліхаманкава ствараюць структуры для правядзеньня падманных псэўдавыбараў. На гэтую кампанію ім, па усім відаць, абяцаныя чарговыя фінансавыя ўліваньні з Масквы і Брусэля.

Стала вядома, што дзеячыкі (найперш камуністы) абяцаюць заплаціць даляры таму, хто зьбярэ для „выбарчай кампаніі" групку з дзесяці асобаў і будзе выконваць загады палітычных бізнэсоўцаў. Грошы яшчэ не раздаюць, толькі абяцаюць. Але ўжо знаходзяцца ахвотныя падзарабіць на продажы Бацькаўшчыны. Нягледзячы на тое, што падчас мінулых выбарчых шоў кіраўніцтва псэўдаапазыцыі шмат каму са сваіх кліентаў на раёнах не заплаціла абяцаныя грошы. Потым у шэрагу месцаў сталічных ваяжораў-„грантадаўцаў" мясцовыя дзеячы сустракалі пытаньнямі „Дзе нашыя грошы?!" Фарс паўтараецца ў каторы раз. Неабходна, каб сумленныя людзі Беларусі рэгістравалі гэтыя ганебныя выпадкі палітычнага подкупу, складалі грамадзкія пратаколы на такія выпадкі і папярэджвалі мясцовых людзей, каб не заплямліваліся супрацоўніцтвам з гэтымі структурамі, якія, прыкрываючыся шапкай „апазыцыі", фактычна спрыялі антынароднаму рэжыму ў ягоных „элегантных перамогах" на выбарчых шоў.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*8 чэрвеня 2008 г.*

# САКАВІК – 2008

11-га красавіка, адбылася дрэнная падзея, якая па значэньні для народа роўная публічнаму парваньню Сьцяга зграяй Ціцянкова і зьняцьцю Пагоні з

Дому Ўраду. Рэжым дэмантаваў помнік Багдановічу ў Менску, каб перанесьці ў іншае месца.

Магчыма, прыкра шмат каму назіраць, што за 14 гадоў хамскага зьдзеку зь Беларусі грамадства ні ў чым істотна не перамянілася. Але быў час, калі існавала іншае грамадзтва, якое жыло годнасьцю, духам, культурай і веліччу Бацькаўшчыны. Гэтым грамадзтвам мроіў у несьмяротнай „Пагоні" наш вялікі Максім Багдановіч. Гэтае грамадзтва мы, беларусы, адродзім, узьдымем з шэрасьці, дрымоты і паняверкі. У гэтым унутраны сэнс нашай палітыкі і штодзённай працы.

Крыніцу сілы і моцы беларускага грамадзтва добра разумеў маскоўскі непрыяцель нашага існаваньня. Сто пяцьдзесят гадоў спатрэбілася Маскве, каб цалкам зьнішчыць наш набілітэт (нашчадкаў шляхты і беларускай інтэлігенцыі дабівалі ўжо за часы сталінскага генацыду). І толькі тады, пасьля вынішчэньня народнай эліты, людзей гонару і сумленьня, грамадзтва ўтапілася ў цемру, у сьлепату і прыняло над сабой уладу цемры, і стала жыць страхам, і пагадзілася на гвалт. У гэтым, найперш, генэральная і мэнтальная прычына вось ужо скора чатырнаццаці гадоў трываньня прамаскоўскага рэжыму на Беларусі. ***Беларускае змаганьне за волю, культуру і дэмакратыю ў гэтакіх умовах ёсьць найперш змаганьнем нацыянальнага авангарду.***

У канцы XX стагоддзя мы стварылі такі авангард і, абапіраючыся на антыкамуністычны настрой грамадзтва, вярнулі незалежнасьць Беларусі. Выразная і канкрэтная стратэгія Адраджэньня абумовіла і выразную тактыку нашай мінулай і цяперашняй палітычнай працы: стварэньне нацыянальнага грамадзка-палітычнага авангарду (беларускай сілы), доступ нацыянальнай эліты да ўлады і адначасна нацыянальна-дэмакратычная асьвета грамадзтва, на якое мусіць абаперціся авангард, каб прыйсьці да ўлады, адрадзіць і адбудаваць вольную Беларусь.

Прычына паразы Беларускага Адраджэньня ў 1992 г. (ліквідацыя рэфэрэндуму аб выбарах) і ў 1994 г. (няўдача ў выбарах прэзыдэнта) заключалася ня толькі ў існаваньні татальнай савецкай улады і савецкага КГБ, але і ў мэнтальнасьці старой савецкай сьведамасьці грамадзтва, непадрыхтаванага да адэкватнага ўспрыняцьця нацыянальнай ідэі, да свабоды, да пераходных цяжкасьцяў навізны і да змаганьня за агульную долю.

Масква выдатна разумее гэтую простую паліталёгію і скарыстоўвае беларусафобскі рэжым Лукашэнкі (найперш праз агентуру), як кажуць, на ўсе сто адсоткаў. ***Вынішчэньне беларускага йдзе па ўсіх накірунках, рознымі мэтадамі, але пасьлядоўна, паступова і мэтадычна.*** Ствараюцца нагоды, робяцца правакацыі для масавых рэпрэсіўных дзеяньняў, прымаюцца абсурдныя антынародныя законы.

Маскоўская і прамаскоўская агентура на Беларусі найбольш шчыльна кантралюе сілавыя структуры (гэбізм гэта якраз умее рабіць). Дзеяньні сілавых структураў (з поўнай згоды і пад наглядам Лукашэнкі) носяць канкрэтны рэпрэсіўны характар з індывідуальнай „прапрацоўкай" кожнага беларускага ворага. У мінулым годзе кіраўнік КГБ расейскі генэрал Жадобін нават пахваліўся (трэба ведаць расейцаў), што яны ўжо падлічылі 1767 небясьпечных для рэжыму беларусаў, якія (трэба разумець) пры аказіі будуць рэпрэсаваныя (ці ліквідаваныя).

Беларусам варта не забывацца, што бальшыня расейскіх генэралаў – гэта бандыты ў лампасах, і аднесьціся да словаў генэрала Жадобіна сур'ёзна (гумар бо ў генэралаў не прыжываецца). Аднак, я не заклікаю нашу інтэлігенцыю і моладзь асьцерагацца, баяцца ці хавацца. Сур'ёзнасьць палягае на фізічным законе, што на кожнае дзеяньне ёсьць супроцьдзеяньне. Супраць жадобінскага сьпісу на ліквідацыю беларусы павінны скласьці свой сьпіс. І што характэрна – ў яго ня прыдзецца ўключаць тысячы жадобінцаў. Хопіць толькі ўпісаць дзясятак-паўтара маскоўскіх цемрашалаў, каб падчас дзеяньня фізічнага закону гэтая акупацыя дзяржымордаў (калі толькі яны пачнуць) пасыпалася, як гара парожніх бутэлек з-пад маскоўскага піва. Будуць драпаць пешкі да Масквы, як некалі, толькі пяткі заблішчаць. (Зрэшты, такі сьпіс справа не складаная.)

25 Сакавіка, у юбілейны Дзень 90-х угодкаў Незалежнасьці БНР, рэжым арганізаваў свой чарговы выклік у твар усім беларусам – жорстка зьбіў людзей на вуліцах Менска, што выйшлі адзначыць вялікае сьвята Незалежнасьці Айчыны. Пабілі і арыштавалі каля дзевяноста чалавек (якія, дарэчы, не рабілі нічога антыпраўнага). Зьвярніце ўвагу на гэты адзін з тысячы тыповых фактаў. ***Гэтак, як было ў Менску 25 Сакавіка, гэтак ненавідзяць, непаважаюць людзей і гэтак адносяцца толькі да акупаванага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі.*** Ніякога права і ніякіх праўных нормаў, стаўка толькі на сілу, грэблівасьць да людзей, якіх трактуюць як жывёлу. Нічога сьвятога, ніякай павагі да нацыянальных пачуцьцяў і да годнасьці чалавека; зьбіваньне і зьнявага жанчын, усьведамленьне беспакаранасьці за свае ўчынкі. І ўсё гэта, паўтаруся, у юбілейны Дзень вялікага нацыянальнага сьвята. Адкрытая агрэсіўная і дэманстратыўная непавага.

Тут жа, неўзабаве пасьля нападу на людзей у Менску, пачаліся вобшукі, ператрусы ў журналістаў і экспрапрыяцыя (проста рабаваньне з санкцыі пракурораў) электроннага абсталяваньня. Практычна, была выключана з працы ўся журналісцка-інфармацыйная сістэма Беларускага тэлебачаньня БелСАТ на Беларусі.

На што тут трэба зьвярнуць увагу? Перш за ўсё, на тое, што гэтыя акцыі і правакацыі рыхтаваліся рэжымам заранёў (санкцыі на ператрусы ў журналістаў пракуратура выдала яшчэ 17 сакавіка). Яны зьяўляюцца часткай агульнага пляну вынішчэньня беларускага руху перад новымі інтэграцыйнымі дзеяньнямі, якія Масква ў чарговы раз плянуе на восень гэтага года. Дзейнічаюць груба і па-кагэбоўску. (Бо інакш ня ўмеюць – улада кагэбоўская.)

Пасьля агрэсіі 25 і 27 сакавіка цэлая чарада так званых „аналітыкаў" пачала „аналізаваць", адводзіць увагу іншых у тупік ад рэальнасьці, з важным выглядам казаць пра „гульні" Лукашэнкі з Эўразьвязам, пра „суперніцтва" групаў ва ўладзе рэжыму і т.п. лухту. Тут, аднак, усё зразумела.

Цікава паслухаць таксама маскоўскі бок, асабліва „рупараў", тыпу шпіёна Суздальцава. Задача гэтых зрабіць выгляд, што Расея тут ні пры чым, што новая хваля брутальных антыбеларускіх рэпрэсіяў – гэта, маўляў, адлюстраваньне няўзгодненасьці і змаганьня за прыхільнасьць Масквы ўнутры самой рэжымнай улады на Беларусі і г. д.

У прынцыпе, нічога новага ў сакавіцкай агрэсіі мы не знаходзім. Тыповыя дзеяньні акупацыйнага рэжыму і тыповая пазыцыя Масквы. Усё, як заўсёды, так і цяпер. Але істотна адзначыць, што ***акцыі і паводзіны рэжымных уладаў на Беларусі становяцца ўсё больш цынічнымі і дэманстратыўна антыбеларускімі.*** Справа ня ў тым, што яны вырашылі больш не хавацца, справа ў тым, што чужыя людзі ня могуць доўга прыкідвацца сваімі, асабліва, калі нас ненавідзяць. „А пачэму разгаварываеце па-беларускі? Вы что, фашыст?" – рычэў некалі генэрал Жадобін на майго намесьніка Юры Адамавіча Беленькага. Гэта у 2000 годзе, калі была спроба забойства Ю. Беленькага гэтымі ж „сілавымі структурамі". Тады сумнавядомы Ганс Вік, які супрацоўнічаў у антыбеларускай справе з КГБ, разам са сваёй камарыльляй усяляк стараўся замоўчыць факт нападу на Ю. Беленькага. Памятаю, як ён яшчэ апраўдваўся перад радыё „Свабода" і нешта лепятаў накшталт „у нас все равны" і „мы не вылучаем, хто пацярпеў больш, хто менш" і г.д. Тады шпіёна Віка мы (Фронт) аб'явілі пэрсонай нонграта. Пра генэрала Жадобіна крамлёўцы ўспомнілі ў Маскве пазьней. Нядаўна ён стаў кіраваць КГБ у Менску і складаць сьпісы на Беларусаў.

Насіленьне антыбеларускіх рэпрэсіяў, па ўсім відаць, будзе працягвацца. Па-першае, кагэбоўская ўлада нічога іншага ня ўмее рабіць, як сачыць і душыць. Яна навучана толькі гэтаму і гэтакую яе палітыку мы бачым у Расеі і Беларусі. Таксама Крэмль-Лубянка цяпер у трывожным стане, які пераходзіць у лёгкую паніку. Бо нягледзячы ні на што, Беларусь жыве. Жыве і трывае. Нягледзячы на задушную атмасфэру і рускую школу, нягледзячы на тое, што спадары імітатары і грантасмокі з падстаўной апазыцыі разбэсьцілі і зглумілі цэлае маладзёвае пакаленьне канца 90-х гадоў, нягледзячы ні на што – нарастае новая беларуская моладзь, якая змагаецца за Беларусь, як умее, але галоўнае – з сьветлымі думкамі і з Богам у сэрцы.

Пералом адбудзецца тады, калі моладзь падтрымаюць бацькі. Гэтага закардонныя стратэгі ад імпэрыі Чэка асьцерагаюцца найбольш.

Хай асьцерагаюцца. Мы таксама ведаем, што трэба рабіць. Антыбеларускі рэжым і гэбоўская ўлада ў Маскве адкрыта выступаюць супраць Беларусі, беларускіх людзей, беларускай эліты, беларускай мовы і беларускай культуры (успомнім пуцінскія „мухі-катлеты" і „шэсьць вобласьцяў"). Беларусы ў гэтай сытуацыі павінны таксама адкрыта бараніць Беларусь і гнаць жадобіных у грыву і хвост. І магчымасьць такая не за гарамі.

*13 красавіка 2008 г., Нью-Ёрк*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ДЗЕНЬ ВОЛІ Ў ВІЦЕБСКУ

25 сакавіка ў цэнтар Віцебска выйшлі сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ Ян Таўпыга (Сябра Сойму), Алесь Пазьняк і Сяргей Каваленка. Патрыёты ўзьнялі нацыянальныя Бел-Чырвона-Белыя Сьцягі ў гонар 90-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Яны віталі людзей з вялікім нацыянальным сьвятам. У хуткім часе на іх накінуліся тыпы ў паліцэйскім мундзірах, якія выконвалі загады антыбеларускага рэжыму. Іх схапілі і адразу павезьлі ў суд. Суддзі вынесьлі свой звычайны акупацыйны прысуд беларусам. Ян Таўпыга і Алесь Пазьняк атрымалі 8 сутак арышту, Сяргей Каваленка – 10 сутак.

*Інфармацыйная камісія*
*Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*

*26 сакавіка 2008 г.*

# НЯ ЎДАСЦА ПРАЖЫЦЬ, ШУКАЮЧЫ ШЧЫЛІНЫ

У сярэдзіне траўня рэжым ашчасьлівіў насельніцтва яшчэ адным „царскім указам". Цяпер праз межы краіны забаронена правозіць больш за адну адзінку любых прадметаў. Гэта значыць, што калі чалавек вязе з падарожжа дзьве пары шкарпэтак або два капелюшы, то „лішняе" забяруць мытнікі. Ды яшчэ ўлупяць штрафу. Усё гэта нягледзячы на абсурднасьць зусім ня сьмешна. Пасьля таго, як зачыніліся межы суседняй Польшчы, многія прадпрымальныя людзі пачалі езьдзіць на Украіну. Вядома, што на знакамітым гуртоўным рынку ў Хмяльніцку можна было купіць адзеньне ў тры-чатыры разы таньней, чым у Беларусі. Людзі куплялі для сваёй сям'і і рабілі маленькі бізнэс, каб пракарміцца (тым самым забясьпечвалі такіх жа небагатых людзей дробным таварам). Цяпер зачыняецца і гэтая шчыліна ў плоце рэжымнага маразму. Па БТ паказалі выступ афіцэра мытні РБ. Гладкая, халодная фізіяномія патлумачыла на мове акупантаў: „Всё сделано для того, чтобы не обогащались. А то ездят и обогащаются…" Беларусы павінны зразумець, што ня ўдасца пражыць, шукаючы новыя шчыліны ў антыбеларускім рэжыме. Ворагі-акупанты пазбавяць усяго, забяруць апошняе. І будуць сьмяяцца ў твар маўклівым людзям.

***Янка Базыль***

# ПАМЯЦЬ КУРАПАТАЎ

***Дваццаць гадоў таму, 3 чэрвеня 1988, Беларусь прачнулася іншай.***

Яна пакуль яшчэ абудзілася пад гімн СССР і БССР па „радыёкропцы", яна, як і дзесяцігоддзі, кіравалася з Масквы рашэньнямі ЦК КПСС і яго Палітбюро, што педантычна выконваліся ў ЦК КПБ, і зьнешне ні ў Менску, ні ў іншых гарадах ці ў вёсках ўсё заставалася па-ранейшаму, – але з гэтага дня Беларусі было наканавана зьмяніцца.

У той дзень штотыднёвік „Літаратура і мастацтва", які рэдагаваў Анатоль Вярцінскі, надрукаваў артыкул Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва „Курапаты – дарога сьмерці". (Пісаў артыкул ад першага да апошняга слова адзін Пазьняк, але палічыў тактоўным узяць у суаўтары калегу, зь якім праводзіў дасьледваньне). З двух назоваў гэтай мясцовасьці – агульнапрынятай „Брод" і малавядомай лакальнай „Курапаты"– Пазьняк выбраў апошнюю, палічыўшы, што яна дае больш поўнае адлюстраваньне зьявы. Тое, як удалося надрукаваць артыкул – асобная тэма, якая, бясспрэчна, павінна быць зафіксаваная для гісторыі. Але сёньня – пра вынік.

У тыя часы гарбачоўскай „перабудовы" пра рэпрэсіі ў афіцыйнай прэсе пісалася шмат. Чаму ж менавіта адкрыцьцё Курапатаў мела такі моцны эмацыйны і, пазьней – палітычны эфэкт?

Тагачаснае камуністычнае кіраўніцтва БССР калі і не адмаўляла наяўнасьць рэпрэсій, дык сьцьвярджала, што гэта – „скажэньне ленінскай палітыкі". Абвергнуць факт растрэлаў і катаваньняў ім было немагчыма, але лёгка ствaралася ўражаньне, што усё гэта было не на беларускай зямлі, а недзе далёка – у Магадане, у Сібіры, у Казахстане, ці ў маскоўскай Лубянцы. Газэты пісалі пра трагічныя лёсы Бухарына, Рыкава, Каменева – прадстаўнікоў партыйнай эліты (ня меньш вінаватых у прыходзе да ўлады бальшавікоў на чале з Леніным, чым сам Сталін).

Пазьняк сказаў (упершыню), што забівалі вось тут, побач, дзе ты ці твой знаёмы у мінулую суботу з кампаніяй смажылі шашлыкі. Пазьняк цытаваў расповеды жыхароў навакольных вёсак, і нешта жахлівае было ў тым спалучэньні будзёнасьці і трагедыі, якая ажывала ў словах сьведкаў. Пазьняк даказаў, што зьнішчалі ня толькі вышэйшую наменклатуру, ня толькі інтэлектуальную эліту (хаця, канешне, вынішчаць імкнуліся найперш эліту, ды і нацыянальна арыентаванае кіраўніцтва таксама), – забівалі тысячы простых сялян, тысячы звычайных рабочых.



(Фота „Радыё Свабода")

*5. Дзень Незалежнасьці. Менск. 25 – га Сакавіка 2007 г.*

Пазьняк даў прыблізную лічбу забітых у Курапатах – ня меньш за 102 тысячы чалавек (у кожным пахаваньні ў сярэднім 200 нябожчыкаў). Але рэальная лічба, пісаў ён, большая, бо колькасьць пахаваньняў магла дасягнуць 900 – значыць, колькасьць забітых сягае за 200 тысяч. Гэта больш, чым колькасьць жыхароў у сёньняшнім Полацаку і Наваполацку разам узятых. (Прыкметна, што нават энцыкляпэдычны слоўнік „Беларусь", выдадзены ўжо пры Лукашэнку, падае лічбу 50 тысяч чалавек).

Больш як 200 тысяч чалавек– гэта, усё ж, не „асобныя прадстаўнікі" народу і нават не „шырокае кола прадстаўнікоў". Гэта ўжо – сам народ.

І, нарэшце, ён сказаў, што зьнішчалі – менавіта беларускі народ. У апошніх радках артыкулу прагучала слова „генацыд". Ужо пазьней дасьледчыкамі было даказана, што сярод тых, хто расстрэльваў, адзінкі паходзілі з Беларусі – у канцы 30-ых гадоў НКВД было сфармавана пераважна з выхадцаў з расейскіх вобласьцяў.

Было упершыню сказана пра мэтанакіраванае зьнішчэньне нацыі – і нацыя ўспрыняла, адгукнулася яднаньнем, самаарганізацыяй. Мне ужо даводзілася пісаць, што пэрыяд апошняга нацыянальнага Адраджэньня вызначаны двума датамі – публікацыяй артыкулу пра Курапаты 3 чэрвеня 1988 году і „рэфэрэндумам" 14 мая 1995 г. аб лёсе ( лёсе ў лукашэнкаўскай Беларусі, канешне, а ня ў вечнасьці) Бел-Чырвона-Белага Сьцяга, „Пагоні" і беларускай мовы.

Менавіта артыкул у ЛіМе даў штуршок да стварэньня 19 кастрычніка 1988 году „Мартыралогу Беларусі" і аргкамітэту БНФ. Абапіраючыся на Народны Фронт і яе дэпутацкую групу ў Вярхоўным Савеце, Пазьняк здолеў ня толькі абвясьціць ідэю беларускай Незалежнасьці, але і рэалізаваць яе палітычна. 27 ліпеня 1990 году была прынятая Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце, а і 25 жніўня 1991 года ёй быў нададзены статус канстытуцыйнай сілы. Гэта быў рэальны палітычны вынік. Ён быў дасягнуты шмат якімі прагматычнымі, матэматычна выверанымі крокамі лідэра БНФ – і падтрымкай тысяч актывістаў Народнага Фронту, прыхільнікаў дэмакратыі, якія выходзілі на плошчу перад Домам ураду. Але сымвалічна, што пачатак такога рэальнага палітычнага выніку бярэ пачатак у духоўным – у вяртаньні нацыі памяці пра Курапаты, дзе палеглі і тыя, хто ўтварыў 25 сакавіка 1918 г.

Беларускую Народную Рэспубліку, ды так і не пабачыў ідэю беларускай дзяржаўнасьці рэалізаванай...

Ёсьць яшчэ адзін аспэкт, у той час не заўважаны грамадзтвам, але, пэўна ж, дакладна пралічаны тымі, хто ўспрыняў артыкул як удар па сваіх ідэалах. Адкрыцьцё Курапатаў – гэта і знаходкі матэрыяльных улік для магчымага судовага працэсу над камунізмам. Выступы і рэзалюцыі XX і XXII-га партыйных з'ездаў з асуджэньнем „культу асобы" могуць быць сьпісаныя на палітычную барацьбу партыйных кланаў ці ўспрынятыя як ускосныя ўлікі. Прастрэленыя чарапы, косьці, кулі ад наганаў – гэта ўжо непасрэдныя, відочныя доказы. Магчыма, у гэтым і ёсьць адна з галоўных прычынаў нянавісьці, якую маюць да Пазьняка палітычныя спадкаемцы бальшавізму.

Уступ да артыкулу напісаў Васіль Быкаў, і пазьней, на Дзяды, Васіль Уладзімеравіч заўсёды прыходзіў на шэсьце ў Курапаты, якое ладзіў Беларускі Народны Фронт.

На тыя шэсьці зьбіраліся мы звычайна каля вядомага дому на пачатку галоўнага праспэкту сталіцы і ставілі шыльду: „Адсюль, з будынка НКВД, пачынаўся пакутны шлях у Курапаты. Вечная памяць ахвярам бальшавіцкага тэрору!". Быкаў казаў кароткую прамову, выступалі Рыгор Барадулін, вязень ГУЛАГу Сяргей Грахоўскі, а потым рушылі па праспэкце – да саміх Курапатаў.

Шыльда ля былога НКВД назаўтра, канешне, зьнікала. У гэтым доме (пасьля вайны ён разбудаваны ў квартал карпусоў) цяпер захоўваюцца ўсё яшчэ не рассакрэчаныя тысячы, дзесяткі тысяч спраў і забітых, і тых, хто забіваў.

Якія такія дзяржаўныя таямніцы ўтрымліваюць тыя паперы, што і праз семдзесят год яны маюць грыф „сакрэтна"? Якія таямніцы ахоўвае ўлада? Мэтады вербоўкі стукачоў, парадак афармленьня палітычных даносаў? Тэхналёгію забойства двух чалавек адной куляй (гэтак часта рабілі ў Курапатах)? Спосабы пахаваньня трупаў у некалькі пластоў?

Гэта таму сакрэтна, таму важна, што – спатрэбіцца? І ці трэба разумець, што калі КДБ перахоўвае таямніцы НКВД, яно зьяўляецца спадкаемцам (духоўным і палітычным) гэтага самага НКВД?

Нядаўна новапрызначаны кіраўнік „ідэялягічнага упраўленьня" на пытаньне, чаму адкрытая „лінія Сталіна", адказаў, што існуюць людзі, для якіх з імем Сталіна зьвязаныя іх маладыя, лепшыя гады і перамогі пад час вайны. І што іх пачуцьці трэба паважаць. Уявіце, што ў сучаснай Нямеччыне архівы СС – засакрэчаныя (бо нельга выдаваць прафэсыйныя таямніцы спэцслужбаў). Што ёсьць вуліцы Гітлера і Гімлера – бо, маўляў, жывуць яшчэ тыя, для каго вобраз фюрэра і ягоных паплечнікаў атаясамліваецца зь іхняй маладосьцю, з энтузіязмам будаўніцтва першых аўтабанаў, з перамогамі на Заходнім і Усходнім фронтах...

Паважаючы пачуцьці прыхільнікаў Сталіна, улада ні словам, ні справай не прыгадвае пра пачуцьці былых вязьняў ГУЛАГу, родных і блізкіх тых, хто расстраляны ў Курапатах. Ужо пры Лукашэнку іх пазбавілі нешматлікіх ільготаў ( значна меншых, чым у вэтэранаў НКВД-КГБ).

Пагаджуся з тымі, хто кажа, што нельга параўноўваць нацызм з камунізмам, СС з НКВД-КДБ. Нацызм праіснаваў толькі дванаццаць гадоў – камунізм больш як семдзесят, і колькасьць ахвяраў камунізму значна перавышае колькасьць тых, хто загінуў ад рук нацыстаў. І ўсё ж справа ня толькі ў лічбах. Калі тады, на мяжы 1980-90 гадоў, Пазьняк казаў пра неабходнасьць суду над камунізмам па тыпу Нюрнбергскага, ён падкрэсьліваў, што гаворка найперш пра асуджэньне ідэалёгіі, без чаго ісьці далей будзе немагчыма.

Але тыя, хто зьдзекваўся з той ідэі, жадалі рухацца не наперад, а назад.

Дайшлі да „лініі Сталіна". Цяпер туды, а не ў Курапаты возяць экскурсіі.

За дваццаць гадоў у Курапатах былі прэзыдэнты, лаўрэаты Нобэлеўскай прэміі, замежныя дыпляматы – Лукашэнка ніводнага разу не прыехаў. Прыкметна і тое, што, знаходзячы і караючы аўтараў надпісу „Жыве Беларусь!", міліцыя і спэцслужбы ніколі не адшукалі тых, хто разьбіваў памятны знак Клінтана , ламаў крыжы, апаганьваў магілы.

У пачатку 90-ых гадоў адмысловая камісія павінна была прапанаваць праект мэмарыялу ў Курапатах. Ці то сутыкнуліся амбіцыі скульптараў ды архітэктараў, ці то адмыслова справа была зацягнутая да моманту, калі рэпрэсіі ізноў вярнуліся ў арсэнал улады – але ідэя мэмарыялу не ажыцьцявілася. Аднак часам мне падаецца, што ў гэтым ёсьць пэўны глыбокі сэнс. І ня толькі таму, што нават самы лепшы праект ня можа быць адэкватны маштабу нацыянальнай трагедыі. Добра разумеючы сутнасьць цяперашняй улады, простыя людзі прыходзяць і ўсталёўваюць тут крыжы. Кожную суботу актывісты Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ ладзяць тут талаку, расчышчаюць зямлю ад сьмецьця.

Ствараецца сапраўды народны мэмарыял. І, урэшце, памяць – не у мармуры, а ў сэрцах.

***Сяргей Навумчык***

*(Паводле: „ Народная воля", 29 траўня 2008)*

# АКТ ВАНДАЛІЗМУ Ў КУРАПАТАХ

Уначы на 12 сакавіка на тэрыторыі Народнага Мэмарыялу ў Курапатах адбыўся чарговы акт вандалізму. Злачынцы паламалі і кінулі на зямлю 34 крыжы, таксама пашкодзілі шэраг крыжоў на магілах ахвяраў. Такога вялікага зьнішчэньня беларускай сьвятыні не было з восені 2001 года, калі адбываўся наступ антыбеларускага рэжыму з мэтай зьнішчэньня Народнага Мэмарыялу. Безумоўна, чарговы прыступ сатанінскай нянавісьці да сьвятога Крыжа, да нашай сьвятыні і магілаў пакутнікаў зьвязаны з набліжэньнем Дня Волі – 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. Улада цемры калоціцца ад страху і нянавісьці. У 2001 годзе беларускія патрыёты абаранілі Курапаты ад рэжымных варвараў. Абарона сьвятыні працягваецца.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
*13 сакавіка 2008 г.*

# КРЫЖЫ Ў КУРАПАТАХ АДНОЎЛЕНЫ

15 сакавіка сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ правялі ў Курапатах вялікую талаку. Больш за сорак сяброў і прыхільнікаў Партыі аднаўлялі паламаныя і пашкоджаныя вандаламі крыжы на магілах ахвяраў расейскай акупацыі на тэрыторыі Народнага Мэмарыялу. Агульнымі намаганьнямі былі адрэстаўраваны усе пашкоджаныя крыжы. Талака была скончана сьпяваньнем гімну „Магутны Божа".

Ад псэўдаапазыцыі быў заўважаны адзін маладзёвы дзеячык. Ён зьявіўся на тэрыторыі Мэмарыялу ў сьвяточным строі, даў інтэрвію журналістам пра тое, „як яны клапоцяцца пра Курапаты", і пайшоў прэч.

Заўважана была таксама прысутнасьць „славных органов" рэжыму. Было б добра, каб яны ў такой колькасьці ахоўвалі сьвятыню ад злачынцаў. Пасярод працуючых людзей шпацыравалі міліцэйскія патрулі. Ланцугом стаялі каля падземнага пераходу міліцэйскія і гэбоўскія афіцэры. Штодзесяць хвілін яны давалі справаздачы начальству па рацыях. Беларусы зразумелі, што „органы" былі мабілізаваны рэжымам, бо рэжым баіцца самастойных дзеяньняў беларусаў, якія не баяцца. Але найбольш актыўнымі ў гэты дзень былі „славные органы" ДАІ, якія апошнім часам уславіліся стварэньнем жывога шчыта з людзей на дарогах. Машыны і групы ДАІ заблякавалі ўсе дарогі і сьцяжыны, што вядуць на Курапаты. Мэтай майстроў „жывога шчыта" было не дапусьціць на тэрыторыю Мэмарыялу аўтамашыны з матэр'яламі і інструмантамі, неабходнымі для рэстаўрацыі крыжоў. Аднак, патрыётам усяроўна ўдалося прарвацца праз кардон даішнікаў і забясьпечыць талакоўцаў усім неабходным. Рэжым пастаянна дэманструе сваю сутнасьць – гэта антыбеларуская, антынародная ўлада.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
*15 сакавіка 2008 г.*

# НАРОДНЫ МЭМАРЫЯЛ КУРАПАТЫ.

***(выступ на 20-я ўгодкі адкрыцьця Курапатаў)***

Мінула 20 гадоў з таго часу, як Беларусь даведалася пра Курапаты. Памятаем, што гэтая падзея ўскалыхнула народны дух, узрушыла і мабілізавала




(Фота з калекцыі С. Абламейкі)

***6. Менск, 19 – га чэрвеня 1988 г. Людзі йдуць на мітынг ў Курапаты.***

людзей дамагацца волі, праўды і справядлівасьці. Усё гэта засьведчыла, што, нягледзячы на 70 гадоў савецка-расейскай няволі і вынішчэньня, наш народ ёсьць духоўна жывы і здольны змагаца за агульную справу. Рэчаіснасьць паказала, што менавіта з Курапатаў адбыўся штуршок, які прывёў да ўтварэньня Беларускага Народнага Фронту. Менавіта адсюль, ад гэтых расстрэльных магілаў, пачалося зьмёртвыхустаньне Беларускай нацыі, якую ўжо зьбіраліся пахаваць ворагі Беларушчыны. Курапаты займаюць асаблівае месца ў Беларускай гісторыі і культуры.

Гэта сакральнае месца нашага мартыралогу і нашага новага Адраджэньня. Кожнае пакаленьне беларусаў павіна памятаць, шанаваць і берагчы гэтае знакавае і пакутнае месца.

Дзякуем сябрам з Радыё Свабода, якія парупіліся своеасаблівым чынам адзначыць 20-я ўгодкі адкрыцьця Курапатаў, арганізаваўшы конкурс „Мае фота – мае Курапаты”. Дзякуем усім удзельнікам гэтага конкурсу, якія адгукнуліся і прыслалі свае фатаграфіі. Гэтая праца і іхны ўдзел ня зьнікнуць, не змарнуюцца, а паслужаць беларускай гісторыі і навуцы.

Тут, гаворачы ў асяродздзі аднадумцаў, я хацеў бы паразважаць з вамі пра сэнс Курапатаў, пра зьмест нашай працы і пра будучыню Народнага Мэмарыялу. Вы зьяўляецеся сьведкамі, як крок за крокам, дзень за днём, ня гледзячы на цяжкасьці і разбурэньні, сакралізуюцца Курапаты, вырастаюць крыжы побач з соснамі, разьлягаецца хвойная ціша… Там, дзе пра памяць забітых сьведчыць мноства людзей, – там зьяўляецца і жыве шчыры народны дух.

Народны Мэмарыял быў запачаткаваны 29 кастрычніка 1989 года ўсталяваньнем агульнага Крыжа Пакуты ў памяць усіх расстраляных беларусаў. Потым доўгі час цягнулася барацьба з цемрашаламі, адбіваньне нападаў яўных і схаваных энкавэдзістаў. Беларускую грамадзкасьць у гэтай барацьбе ўзначальваў Беларускі Народны Фронт.

У 2000 годзе ідэя Народнага Мэмарыялу была сістэмна распрацаваная ў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. З гэтага ж году пачалося яе пасьлядоўнае ўвасабленьне. „Народны Мэмарыял” быў задуманы як вынік натуральнага народнага шэсьця і крыжаўсталяваньня. Побач з прыродным лесам, унутры яго і разам зь ім, мусіў паступова зьвіцца „Лес Крыжоў” як сымвал нявінна забітых душаў, што прарасьлі крыжамі і дрэвамі з палітай крывёю зямлі. Кожны беларус можа прынесьці ў Курапаты (ці замовіць прынесьці) свой Крыж у памяць расстраляных людзей. Такім чынам мэмарыял „Лес Крыжоў” – гэта неперапынны, вечны працэс народнай памяці. Стаўленьнем крыжоў у Курапатах народ заўсёды будзе сьведчыць аб сваёй памяці пра генацыд, а сам мэмарыял робіцца паказьнікам, „бaромэтрам” гэтае памяці.

Мінула сем гадоў – і Народны Мэмарыял ёсьць. Ён існуе і рухаецца, кіруецца ў вечнасьць. Высілкі нашага руху, працы, сэрца і розуму – не змарнаваліся, не былі надарэмна.

Аднак, наперадзе працяг ня толькі працы, але і ідэі.

На пачатку тысячагоддзя рэжым вырашыў пракласьці шырокую аўтастраду праз Курапаты. Прытым паспрабавалі справу зьнішчэньня і справу абароны Курапатаў узяць у адны рукі. Але спробы праваліліся, дзякуючы, перш за ўсё, дакладнаму разуменьню сітуацыі і дакладным дзеяньням Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Тым ня менш, ускрай Курапатаў перарэзала шырокая шаша, па якой імчацца аўтамабілі.

Зыходзячы з канцэпцыі Народнага Мэмарыялу як вечнага разьвіцьця і абнаўленьня (вечнага агню Памяці), разбуральная дарога стала таксама часткай гэтай памяці і зьместу змаганьня за яе сэнс. Гэты „антыпомнік”, пракладзены на касьцях забітых, таксама мусіць быць мэмарыяльным, як дысананс і сьведчаньне падтрымкі генацыду нашчадкамі забойцаў.

Я ўяўляю гэтую дарогу, вымашчаную з абодвух бакоў (пазначаную наўзбоч ад асфальту) контурамі пахавальных пліт, безыменных, толькі даты: 1937-1941. Поўз іх, як поўз шэрагі душ, едуць аўтамабілі па дарозе, якую зрабіў разбуральнік. Паабапал дарогі, таксама, – крыжы і помнікі-скульптуры, у два чалавечыя росты, расстраляных людзей; глядзяць скамянелымі позіркамі на дарогу сучасных.

Ад Курапатаў дарога – у два канцы. І з абодвух канцоў Курапатаў стаяць дарожныя знакі абмежаваньня хуткасьці – 20 км. Гэтага дастаткова, каб расстраляныя каменныя Дзяды паабапал дарогі пазналі б і разглядзелі жывых. Сымволіка гэтай часткі Народнага Мэмарыялу: MEMENTO MORI – усё мінае, не мінае толькі сьмерць.

Зьменіцца час і сама дарога тут стане мёртвай. Па ёй ужо ня будуць езьдзіць машыны і зарастацьме травой… Яна стане экспанатам злачынства. І скамянелыя людзі-помнікі паабапал яе будуць яе дакорам.

Раз у год на Дзяды, разам з крыжамі, сюды прыносяць „Звон Свабоды”. Ён гучыць на Курапацкай Галгофе ў цэнтры Народнага Мэмарыялу. Не для мёртвых. Ён гучыць для жывых, каб над магіламі народа ўзмацнілі дух.

Жыве Беларусь і будзе жыць! Вечная памяць нявінна забітым беларусам! Вечная слава змагарам за шчасьце і долю Беларусі!

*Лістапад 2007-чэрвенеь 2008*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ТРАВЕНЬ НА ПОСТСАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

Па Беларусі „шёл красный первомай”. У сталіцы паўсюль разьвесілі чырвоныя сьцягі. У парках на эстрадах спэцгрупы сьпявалі расейскія „честушкі” і тупалі нагамі. Іх зьмянялі школьніцы, якія ў касьцюмах мышэй танцавалі фінскую польку (даўні акупацыйны закон – „только нічего белорусского”). У якасьці лакальнага апафеоза на сцэну ў парку Горкага вывелі яшчэ адзін ансамбль падлеткаў. Усе яны былі апранутыя ў характэрныя расейскія „рубахі” з крыклівымі лубочнымі ўзорамі. Такі тып касьцюмаў маскоўцы традыцыйна называюць – „Іванушка-дурачок”, а цьверскае насельніцтва – „Ванька-дуранька” і г.д. Усю гэтую русьню, навязваньне бескультур’я і імпэрскага кічу мы бачылі 70 гадоў за саветамі.

* * *

1 траўня партызанская апэрацыя была праведзена ў самым цэнтры Масквы. Да сваіх гаспадароў прыехаў генэрал КГБ Зязікаў (па сумяшчальніцтву „прэзідент” Інгушэціі). Мабыць, выклікалі на Лубянку, а можа ў Крэмль. У 5-зоркавым гатэлі ён сустрэў на калідоры другога інгуша, бізнэсмэна Мусу Келігава (які нацярпеўся ад мафійных структураў, кіруемых у каўказкай рэспубліцы гэтым Зязікавым). Яны „поговорілі”. Праз некаторы час абслуга знайшла прамаскоўскага „президента”, які ляжаў пабіты на падлозе ў калідоры. Пра гэта адразу ж паведамілі расейскія інтэрнэт-выданьні. Але праз пару гадзінаў па камандзе з-за кулісаў яны ж выдалі паведамленьні пад капірку: „Зязікава ніхто ня біў…” У Інгушэціі адбываецца масавы збор подпісаў за выдаленьне Зязікава і вяртаньне на прэзыдэнцкую пасаду папулярнага генэрала Аўшава.

* * *

3 траўня адзначаўся „день прессы”. У Менску каля галоўпаштамта псэўдаапазыцыя наладзіла з гэтай нагоды свой чарговы моб-шмоб. Калі раней на гэтыя клоўнскія „акцыі” высылалі выключна зялёную моладзь, то гэтым разам „мобілі-шмобілі” начальнікі з прагматычнага Фронту Л. Баршчэўскі, В. Івашкевіч. Яны публічна чыталі і паказвалі мінчанам газэты „Нар. Воля” і „Наша Ніва”. Іх публічна здымала на камэры даволі вялікая група гэбэшнікаў і паліцманаў. Усю гэтую камэдыю Радыё Свабода падавала на поўным сур’ёзе як геройскі і рызыкоўны акт. Цікава, камусьці выгадна паказаць гэтую публіку ў клоўнскай ролі. Каб людзі сьмяяліся і казалі, што „усе гэтыя фронтаўцы такія…” Паводле вясёлага настрою ўдзельнікаў моб-шмоба было зразумела, што іх не бянтэжыць гэтая роля.

* * *

На чэмпіянат па хакею ў Канадзе 3 траўня з Масквы ляцела вялікая грамада „заўзятараў”. Зразумела, што абы якія аматары спорту не маглі дазволіць сабе такія тысячныя выдаткі на паездку. Ляцелі туды звычайныя расейскія бандыты („русскіе ребята”). У небе над акіянам яны напіліся і пачалі біцца. У бойку ўвязаліся дзясяткі пасажыраў эканом-клясы. Аднаго з „ребят” затапталі і задушылі на сьмерць. Калі самалёт падлятаў ў Таронта, яго ўжо чакалі паліцэйскія аддзелы. Расейцаў выводзілі і выносілі пад дуламі аўтаматаў. У ангары быў арганізаваны імправізаваны лягер інтэрнаваньня. Праз чатыры гадзіны большасьць падарожнікаў адпусцілі, а 20 „ребят” пакінулі для далейшага разьбіральніцтва. Пра гэты жах паведаміў толькі інтэрнэт. Расейскія тэлеканалы ўжо даўно не даюць такіх сюжэтаў.

***Янка Базыль***

# ЧАРГОВЫ ФАКТ ВЫНІШЧЭНЬНЯ БЕЛАРУСІ

*Працягваецца поўным крокам вынішчэньне рэшты беларускіх арганізацыяў. Акупацыйная палітыка этнацыду і разбурэньня беларускай грамадзянскай супольнасьці на справе не заціхала ніколі. Асноўная мэтода гэтай палітыкі – яе плянавасьць і павольнасьць рэалізацыі (дзеля пазьбяганьня пратэстаў; маўляў, нацыя павінна прызвычаіцца да сваёй сьмерці). Але ў канцы працэсу (па меры вынішчэньня) павінна адбывацца яго інтэнсіфікацыя, дзеяньні стануць што раз больш брутальныя і груба рэпрэсіўныя. Калі антыбеларускі рэжым праіснуе гэтак яшчэ даўжэйшы час, то дзеяньні яго, з цягам аслабленьня беларускай супольнасьці, абавязкова скончацца фізічным зьнішчэньнем людзей. Ніжэй прыводзім тэкст заявы Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якая сьведчыць пра сутнасьць гэтай палітыкі.*

***Зянон Пазьняк***



***7. 2007 г. Разбурэньне старога Менска. Вуліца Бернардынская (Бакуніна). Справа руіны разбуранага антыбеларускімі ўладамі будынка 18-га стагоддзя.***

„У 2004 г., у Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры незаконна нацыяналізавалі на карысць дзяржавы будынак, які быў адроджаны ў Траецкім прадмесці за сродкі арганізацыі, як практычна і ўсе будынкі гэтага гістарычнага кварталу. У ў дзяржавы хапіла сумлення зрабіць былога інвестара арандатарам, а зараз, у выкананні чарговага прэзідэнтскага ўказу па эканамічнаму знішчэнні грамадзянскай супольнасці, з Таварыствам не працягнута дамова арэнды, і арганізацыі прапанавана 15.05.2008 г. да 15.00 пакінуць свае памяшканні.

Таварыства не згадзілася пакінуць памяшканне, і паведаміла арэндадаўцу пра свой намер дамагацца не толькі працягу дамовы арэнды, але ж арэнды бясплатнай. У адказ, КУП „Менская спадчына” – прадпрыемства падпарадкаванае Менгарвыканкаму, якое з’яўляецца арэндадаўцам, без афіцыйнага папярэджання, у адсутнасць прадстаўнікоў Таварыства, апячатала офіс Рэспубліканскай і Менскай гарадской радаў грамадскага аб’яднання.

Задушэнне арганізацыі праз пазбаўленне юрыдычнай адрэсы Таварыства разглядае, як помсту дзяржаўных органаў грамадзкаму аб’яднанню, якое за апошні год актывізавала сваю працу ў галіне маніторынгу за выкананнем заканадаўства па ахове помнікаў, інфармавання беларускага грамадства і міжнароднай супольнасці па фактах яго парушэння, якое ў Беларусі наагул і Менску, ў прыватнасці, набыло татальны характар.

Рэспубліканская і Менская гарадская рады заяўляюць, што дзеянні купкі карумпаваных служачых Менгарвыканкаму і работнікаў „Менскай спадчыны” разглядае, як цынічную правакацыю і выклік грамадзкай ініцыятыве ў Беларусі. Кіраўніцтву Менгарвыканкаму і яго структурных падраздзяленняў , якое даўно манапалізавала права вызначаць горадабудаўнічую палітыку толькі на карысць

папаўнення сваех уласных кішэняў, не атрымаецца задушыць інфармаванне грамадства пра факты адвольнага абыходжання з ахоўным заканадаўствам.

Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры будзе працягваць сваю дзейнасць у любых умовах, нават пры пазбаўленні рэгістрацыі. У сучасны момант толькі прынцыповай і бескампраміснай пазыцыяй можна спыніць гвалт над нашымі нацыянальнымі гісторыка-культурнымі здабыткамі". (Падпісана Старшынёй Рэспубліканскай рады Антонам Астаповічам і Старшынёй Менскай гарадской рады Зміцерам Каспяровічам. 26.05.2008 г.)

***-Інф-***

# РАСПРАВА РЭЖЫМУ НАД БЕЛАРУСКІМ ШКОЛЬНІКАМ

*Падзеі ў Салігорску якраз паказваюць на бруталізацыю рэпрэсіяў супраць беларусаў. Рэжым ужо абсалютна не праймаецца існаваньнем якіх бы там ні было законаў, сэнсам і, тым больш, рэакцыяй асяроддзя. Даюць выразна зразумець, што беларусаў перасталі лічыць за людзей, што гэта маса, якую можна не прымаць пад увагу. Далей цытуем з прэс-рэлізу Маладога Фронту, дзе гаворыцца пра дзікі ўчынак рэжыму (чытай – КГБ) – выключэньне са школы вучня Івана Шылы за беларускі патрыятызм і прыхільнасьць да дэмакратыі.*

***Зянон Пазьняк***

„У сярэднюю салігорскую школу №4 прыехала камісія з адзьдзелу адукацыі Менвыканкама. Камісія сабрала на раду выкладчыкаў і паставіла перад імі патрабаваньне аб ануляваньні вынікаў іспытаў Івана Шылы на падставе ягонай актыўнай грамадзкай дзейнасьці і шматразовых затрыманьняў за ўдзел у вулічных акцыях пратэсту.

Аднак настаўнікі адмовіліся выконваць загад менскай камісіі, прыняўшы рашэньне аб мэтазгоднасьці далейшага ўдзелу Івана ў іспытах. У сувязі з гэтым рашэньнем, дырэктар школы Сянькова Вольга Іванаўна напісала заяву аб звальненьні са сваёй пасады па асабістым жаданьні, матывавоўшы гэта тым, што ў яе узьнікнуць сур'ёзныя праблемы. Намесьніца дырэктара па выхаваўчай працы Семчанкова Алена Мікалаеўна пісаць заяву адмовілася і была прымусова звольнена менскім кіраўніцтвам.

Таксама камісія паставіла двум намесьнікам дырэктара, якія засталіся на сваёй працы, - гэта Каштальян Валянціне Міхайлаўне і Янкоўскай Ірыне Вячаславаўне, – ультыматум, паводле якога яны будуць звольнены з працы, калі Іван зьявіцца заўтра на апошні іспыт – на ангельскую мову.

У дадатак да гэтага, намесьнікам дырэктара загадалі скласьці сьпіс усіх настаўнікаў Івана, у якім мусяць быць імёны і месцы працы іхніх сужэнцаў (гэта заказ КГБ, мэтад палітычнага зыску, грубае парушэньне правоў асобы).

*„Відавочна, што дзеяньні менскай камісіі накіраваны на запужваньне непакорных настаўнікаў,* – гаворыць Іван Шыла. – *Але мае настаўнікі зазначылі, што не зьбіраюцца забараняць мне прыходзіць на іспыт. Я ж, канешне, вельмі зьдзіўлены мужнасьцю гэтых людзей і ўдзячны ім за падтрымку".*

Пазьней рашэньнем камісіі Салігорскага аддзелу адукацыі (пры ўдзеле прадстаўнікоў Менаблвыканкаму) Іван Шыла быў выключаны са школы (заўважце, не Педагагічнай радай школы, дзе вучыўся вучань, а бюракратычнай „інстанцыяй"). Свае рашэньне камісія аргумеэтавала тым, што Іван Шыла неаднаразова парушаў унутраны распарадак школы, які забараняе вучням прымаць удзел у несанкцыянаваных акцыях. З юрыдычнага пункту гледжаньня дадзенае рашэньне выглядае абсалютна абсурдным, – пішуць сябры Івана Шылы, – бо нават калі удзел у акцыях лічыць парушэньнем, то прыцягваць за гэта да адказнасьці Івана павінны былі значна раней, а не за дзень да фактычнага сканчэньня школы. Тым больш абсурдным было патрабаваньне чыноўнікаў з Менаблваканкаму ануляваць вынікі іспытаў не таму, што яны лічаць завышанымі адзнакі за іспыты, а на падставе парушэньня ім унутранага распарадку школы.

***-Інф-***

# СПЫНІЦЬ ХІМІЧНУЮ АТАКУ РАСЕЙСКАЙ ФІРМЫ НА МЕНСК

*„Беларуская Салідарнасьць" публікуе інфармацыйны матэрыял па справе змаганьня жыхароў Пухавіцкага раёну супраць будаўніцтва расейскай фірмай заводу ядахімікатаў, які паступіў на наш адрас. Матэрыял варты для азнаямленьня беларускай грамадзкасці.*

Паважаныя беларусы! Жыхары Пухавіцкага раёну Менскай вобласьці, што жывуць у г.п. Сьвіслач, п. Дружны, г. п. Рудзенск, вёсаках: Дукоры, Капейнае, Дрычын, Новае Сяло ды іншых, змагаюцца супраць будаўніцтва заводу па вырабу ядахімікатаў расейскай фірмай „Август". Пасёлак Дружны, ў якім фірма пачала будаваць завод ядахімікатаў, знаходзіцца на адлегласьці дваццаці кілёмэтраў ад Менскай кальцавой дарогі. Тэрыторыя вакол пасёлку Дружны шчыльна заселеная, акрамя населеных пунктаў (пасёлкаў і вёсак), тут шмат дачных каапэратываў .

Завод па вырабу ядахімікатаў з'яўляецца вытворчасьцю першай катэгоры небясьпекі. Ён ня можа будавацца ў густанаселеных раёнах, тым больш каля вялікіх гарадоў. Прыкладам можа быць сама фірма „Август". Яе офіс знаходзіцца ў Маскве, а завод ядахімікатаў ёй дазволілі разьмясьціць у Чувашыі, ў зоне савецкіх ГУЛАГаў. Не далі ёй пабудаваць завод ні ў Маскоўскай вобласьці, ні ў малазаселенай Смаленшчыне, А ў Беларусі, значыць, можна будаваць у самым густанаселеным рэгіёне? Спачатку фірма спрабавала разьмясьціць гэты завод у Менскім мікрараёне Шабаны. Падключыліся вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук, далі адмоўнае заключэньне, далі адмоўную характарыстыку фірме „Август", як несумленнай фірме, і чыноўнікі пабаяліся пайсьці на парушэньне. Не далі дабро на будаўніцтва ў мікрараёне Шабаны. (Заключэньне вучоных дадаецца)

Цяпер, бачыце, пляцоўку для заводу ядахімікатаў адвялі ў пасёлку „Дружны". Расейская фірма „знайшла" спэцыялістаў у Міністэрстве аховы прыроды, якія па справаздачнай экалягічнай запісцы, распрацаванай фірмай, правялі экалягічную „экспэртызу" і далі дазвол на будаўніцтва. Экспэртызу праводзіла галоўны спэцыяліст Г.М.Кошкіна. Экспэртнае заключэньне падпісалі таксама начальнік спецінспекцыі дзяржаўнай экалягічнай экспэртызы праектаў Мінпрыроды А.А.Андрэеў і галоўны спэцыяліст аддзела дзяржаўнай экалягічнай экспэртызы праектаў прамысловага будаўніцтва В.В.Каваленка.

Расейская фірма і мясцовыя „папіхачы" робяць усе , каб прапіхнуць будаўніцтва небясьпечнага заводу ядахімікатаў каля Менску.

Фірма выпускае каля сарака ядахімікатаў, а ў праекце для завода ў п. Дружны паказала толькі шэсьць, каб занізіць паказьнікі шкоднай нагрузкі на асяроддзе. Фірма мае ўласнае канструктарскае бюро і вядзе распрацоўкі розных ядахімікатаў. Кіраўніцтва фірмы расказвае, што найбольш небясьпечныя кампанэнты яна закупляе ў іншых краінах.

Трэба разумець, што маючы ўласнае КБ, яна будзе весьці распрацоўкі ўсіх кампанэнтаў і наладжваць іх вытворчасьць. Як кажуць, „пусьці толькі ў хату". На праўдзівасьць і сумленьне расейскай фірмы разьлічваць нельга. Пра „сумленнасьць" расейскага бізнэсу вядома ўсяму сьвету.

Фірма арганізавала, як цяпер гавораць „піар". Тут табе і забесьпячэньне чысьціні наваколья і ажно 250 рабочых месцаў з „супэрзаробкам" у 500 даляраў і сацыяльны пакет для работнікаў і інш. Фірма раскашэлілася і запрасіла менскіх журналістаў у Чувашскую глыбінку на свой завод, і яны ўжо ў газэтах пішуць, як там, у чувашскіх Вурнарах добра. Нават туды прыязджаюць жыць і папраўляюць сваё здароўе („Беларуская ніва" за 25 сакавіка 2008 г.)

Трэба задацца пытаньнем, чаму расейцы так шчэмяцца са сваімі ядамі ў Менск? Лічым, што ім трэба прэцэдэнт. Калі гэта ім удасца, то на Беларусь пасунуцца іншыя брудныя і небясьпечныя вытворчасьці. Расейцы (саюзьнічкі і дружбаны) ператвораць Беларусь ў сьметніцу і адстойнік.

Такім чынам справа, якую вядуць жыхары Пухавіцкага раёну ў абарону свайго здароўя, тычыцца ўсіх жыхароў Менску і Беларусі.

Нельга дапусьціць будаўніцтва заводу ядахімікатаў расейскай фірмай „Август" нідзе ў Беларусі.

***(„Беларуская Салідарнасьць")***

# ЮРКА ЦЕХАНОВІЧ: „ЛЮБАЯ АЭС ДЛЯ БЕЛАРУСІ – АПОШНЯЯ КАТАСТРОФА”

*Галоўнае пытаньне для Беларусі цяперашняга часу – пазбаўленьне ад прамаскоўскага рэжыму. Пазбавіўшыся яго – вырашыцца многае. Але адначасна беларусам увесь час трэба цяпер змагацца за сваё існаваньне, за сродкі жыцьця, за мову, культуру, школу, маёмасьць, за годнасьць, за будучыню і справядлівасьць, за ўсё сваё, што вынішчаецца варожым рэжымам. У гэтым становішчы санкцыянаванага нацыянальна-культурнага разбурэньня, плян пабудовы атамнай электрастанцыі на Беларусі выглядае асабліва злавесным. Пад пагрозу ставіцца само фізічнае быцьцё беларускага народа і гістарычнае існаваньне яго на ўласнай зямлі. 10 – га лютага Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі Беларускага Народнага Фронту ўтварыў Антыатамны Камітэт (кіраўнік З. Пазьняк), які дзейнічае, каб не дапусьціць пабудовы АЭС на Беларусі. Напачатку ставіцца задача згуртаваць вакол гэтай працы беларускіх адраджэнцаў і беларусаў-спэцыялістаў па медыцыне, экалогіі і энэргетыцы, раскіданых па ўсім сьвеце. Антыатамны Камітэт у разьвіцьці павінен стацца агулнабеларускай сусьветнай ініцыятывай. Першы этап працы – інфармацыя пра праблему. Пасьля Чарнобыля атамная энэргетыка – учарашні дзень чалавецтва. Пра гэта прапануецца ніжэй публікацыя артыкула Юркі Цехановіча. (Глядзець таксама <pbpf.org> за 13.01.2008.)*

*Зянон Пазьняк*

***

Пасьля Чарнобыльскай аварыі мінула амаль 22 гады, народ Беларусі прызвычаіўся да думкі – пра неабходнасьць жыцьця пасьля гэтай самай буйнай у гісторыі чалавецтва тэхнагеннай катастрофы. Зьявілася новае пакаленьне, якое вымушана існаваць ва ўмовах антыбеларускага рэжыму і ведае пра наступствы атамнай катастрофы, толькі ў асноўным па ўспамінах блізкіх і знаёмых.

Народ Беларусі даведаўся ў тыя часы праўду, пра вынікі Чарнобыля, дзякуючы палітыцы Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” (БНФ), які прымусіў тагачаснае злачыннае камуністычнае кіраўніцтва краіны зьняць грыф сакрэтнасьці са шматлікіх дакумантаў, якія неслі жудасную інфармацыю пра наступствы радыяцыі для насельніцтва краіны. Дзякуючы актыўнасьці БНФ, былі разгорнутыя шматлікія дзеяньні па перасяленьню людзей ў незабруджаныя раёны, была прыцягнутая ўвага і адпаведная дапамога шэрагу краін Захаду і ЗША ў справе фінансаваньня, аховы здароўя, будаўніцтва, навуковых дасьледваньняў, аздараўленьня беларускіх дзяцей. Бо на тэрыторыю нашай краіны выпала амаль 70% радыёнуклідаў ад тых што патрапілі ў навакольнае асяродзьдзе з выбухнуўшага рэактара Чарнобыльскай АЭС імя Леніна.

Па самых мінімальных ацэнках, эканамічныя страты, якія панесла Беларусь у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, склалі 235 млрд. дал., амаль чвэрць тэрыторыі краіны забруджаная радыёнуклідамі, пацярпела здароўе мільёнаў людзей.

Час, які прамінуў, пайшоў у пэўнай ступені, на карысьць тым вольным краінам Эўропы і ЗША якія зрабілі высновы, з вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Шэрагам дасьледчыкаў у ЗША было выяўлена, што з траўня па жнівень 1986 г. сярод насельніцтва ЗША адбылося значнае павелічэньне сьмярцяў, у тым ліку немаўлят, а таксама зьнізілася нараджальнасьць. Доказаная сувязь гэтых зьяваў з чарнобыльскімі воблакамі, якія ўтрымлівалі радыёактыўны ёд-131 і які выпаў над ЗША. На поўдні Нямеччыны, дзе чарнобыльскія ападкі былі асабліва значныя, сьмяротнасьць немаўлят павялічылася ў 1986 г. на 35%. Адзначым, што 18 красавіка 2006 на прэсавай канфэрэнцыі ў Маскве, Грынпіс агучыў рэальныя лічбы пацярпелых ад Чарнобыльскай аварыі. Дадзеныя атрыманыя ў выніку працы больш чым за 50 знакамітых навукоўцаў з шасьці краінаў адрозніваюцца ад дадзеных даклада ААН у дзясяткі разоў, у тым ліку і па медычных паталёгіях у людзей. Ад аварыі ў Чарнобылі пацярпелі такія краіны, як Грэцыя, Швецыя, Фінляндыя, Нарвэгія, Славенія, Польшча, Румынія, Швайцарыя, Чэхія, Вялікая Брытанія, Італія, Эстонія, Славакія, Ірляндыя, Францыя, Нямеччына, Латвія, Летува, Данія, Нідэрлянды, Бэльгія, Іспанія, Партугалія, Ізраіль. Агульная плошча забруджаных зямель, толькі цэзіям-137, апрача Беларусі, Украіны і Расеі, склала 45 260 квадратных кілёмэтраў.

Краіны, дзе атамныя станцыі забясьпечваюць каля 50% вытворчасьці электраэнэргіі (Швэцыя, Бэльгія), роўна як і Нямеччына і Італія, дзе доля АЭС істотная, паступова выводзяць АЭС з эксплуатацыі, замяняючы іх больш таннымі, надзейнымі і не такімі небясьпечнымі крыніцамі электраэнэргіі. Адзначым, што у ЗША з 1978 г. не было ўведзена ў дзеяньне ніводнага атамнага рэактара, а з 1972 г. іх не будуюць. Швэцыя адмовілася ад будаўніцтва АЭС яшчэ ў 1987г.

У Аўстрыі больш за 20 гадоў таму, у выніку агульнанацыянальнага рэфэрэндума, была замарожаная амаль гатовая АЭС у Цвентэндорфе. Пасьля аварыі ў Чарнобылі, у Аўстрыі вельмі балюча ставіцца да існаваньня АЭС пабудаваных па савецкіх (расейскіх) праэктах.. Таму калі чэхі ўступалі ў Эўразьвяз, Аўстрыя выступіла рашуча супраць гэтага з-за будаўніцтва АЭС у Тэмеліне (дзе згаданая станцыя будавалася амаль два дзясяткі гадоў). Аналягічная сітуацыя была ў Аўстрыі і адносна славацкай АЭС „Моховцэ”. Экспэрты Эўракамісіі раілі Славакіі зачыніць 1-шы і 2-гі энэргаблёкі АЭС „Багуніцэ” і мадэрнізаваць 3-ці і 4-ты.

Правячая ў Нямеччыне вялікая кааліцыя ўзгадніла праграму паступовага адключэньня ўсіх АЭС. Старыя ліцэнзіі на эксплуатацыю не павінны працягвацца. Будаўніцтва новых АЭС забаронена (на долю нямецкіх АЭС прыпадае 30% выпрацаванай электраэнэргіі).

Адзначым, што адно з патрабаваньняў Эўрапейскага Зьвязу да кандыдатаў на ўступленьне – бясьпека атамных электрастанцыяў.

Нягледзячы на тое, што на Захадзе зачыняюцца АЭС, ім знаходзяць замену ў выглядзе – энэргаашчаджэньня, газатурбінных электрастанцыяў (якія працуюць на вадкім ці газападобным паліве), цеплавых электрастанцыяў (у прыватнасьці тых, што працуюць па прынцыпу „цыркуляцыі кіпячага пласту” (ЦКП), дзе выкарыстоўваецца шырокая гама цьвёрдага паліва – каменны вугаль, буры вугаль, нізкакаларыйныя віды паліва), іншыя альтэрнатыўныя крыніцы энэргіі. Напрыклад, Нямеччына шырока іх выкарыстоўвае і ў бліжэйшыя гады пляную давесьці долю энэргетыкі, з удзелам альтэрнатыўных крыніцаў да 25%.

Варта адзначыць, што ў ЗША і Эўропе тэхналёгія ЦКП для цеплавых электрастанцыяў усё больш шырока выкарыстоўваецца, у тым ліку – у Фінляндыі, Швецыі, Нямеччыне, Францыі. У Азіі, гэта – Японія. У згаданай тэхналёгіі ужываецца каменны ці буры вугаль (таксама, што істотна – нізкакаларыйныя віды цьвёрдага паліва). Можа быць, таксама, разам з сумесным спальваньнем прамысловых і пабытовых адыходаў (пры высокім узроўні аховы навакольнага асяродзьдзя, вядома). Усё гэта спрыяе шырокаму распаўсюджваньню згаданых альтэрнатыўных электастанцыяў. Найбольш буйныя катлы з ЦКП (у тым ліку пад ціскам) пабудаваныя і будуюцца ў Японіі. Варта адзначыць, што ў Заходняй Эўропе, асабліва ў Скандынавіі, усё больш выкарыстоўваюцца розныя віды біямасы для атрыманьня энэргіі. У сувязі з гэтым заўважым, што вядомы расейскі эколаг, чл.-кар. РАН А. Яблыкаў прыводзіў такі факт супрацьдзеяньня ядзернага лобі альтэрнатыўным АЭС-праэктам. Так, напрыклад, для замены састарэлых і небясьпечных рэактараў Ленінградскай АЭС патрэбна каля 4 млрд. даляраў. Амэрыканская фірма „Альстром Пайропауэр” прапанавала ўзамен на гэта экалагічную і больш эканамічна эфэктыўную ТЭЦ за 1,6 млрд. даляраў. Але зварот гэтай фірмы да ўрада і ўладаў Санкт-Пецярбурга (у тым ліку зьвяртаўся да ўладаў і сам А. Яблыкаў) застаўся без адказу. Дадазім яшчэ падобны прыклад – у Чэлябінскай вобласьці Расеі (г. Капейск) была спроба пабудаваць ТЭЦ з тэхналёгіяй ЦКП, пры дапамозе нямецкай фірмы „Агіплян”, быў распрацаваны бізнес-плян, які прайшоў апрабацыю ў Эўрапейскім банку рэканструкцыі і разьвіцьця. У якасьці інвэстара выступала фірма „Фостэр Уіллер-Альстром”. Нягледзячы на эканамічныя і экалагічныя перавагі праэкта, ўсё гэта было пасьпяхова пахавана. Асабліва пэрспэктыўным лічыцца выкарыстаньне тэхналёгіі ЦКП пры сумесным спальваньні біямасы з пабытовымі і прамысловымі адыходамі, што дазваляе эфэктыўна ўтылізаваць адыходы і зьнізіць нагрузку на акаляючае асяродзьдзе. У 1997 г. фірма „Фостэр-Уіллер” ужыла буйнешы ў сьвеце кацёл ЦКП для спальваньня 600 тон за дзень цьвёрдых пабытовых адыходаў пры максімальнай паравытворчасьці 200 т/г.

Адносна нашай краіны (у сувязі з вышэйсказаным) заўважым, што на Беларусі разведана 3 радовішчы бурага вугалю (Жыткавіцкае, Тонежскае і Бры-

неўскае) з агульнымі запасамі больш за 152 млн. т. якія цяпер не эксплуатуюцца. На Жыткавіцкім радовішчы падрыхтаваны для прамысловага асваеньня два поклады з агульнымі запасамі ў 2 млн. т. Вуглі прыдатныя для выкарыстаньня ў выглядзе энэргетычнага і камунальна-пабытовага паліва. Прагнозныя запасы гаручых сланцаў (глыбіня да 600 м ) складаюць да 11 млрд. т і ствараюць буйны сланцаваносны раён плошчаю каля 20 тыс. км2. Папярэдне вывучаны Любанскае і Тураўскае радовішчы. На Беларусі неабходна распрацаваць сучасныя праэкты энэргетычнага выкарыстаньня драўніны. Гэта тычыцца „энэргетычных" лесанасаджэньняў і найперш швэдзкага досьведу, дзе для гэтых мэтаў выдзеленыя ўчасткі зямлі з павялічанай вільготнасьцю і непрыдатныя для вырошчваньня таварнай драўніны. Велізарную пэрспэктыву мае брыкетаваньне пілавіньня, галін, кары, верхавінак дрэў, адыходаў лесаперапрацоўкі і г. д. Пры брыкетаваньні (што даўно робяць на Захадзе) энэргетычная каштоўнасьць драўніны павялічваецца ў 1,5 разы. Страты пры лесанарыхтоўках складаюць каля 2 млн. м3.

Устаноўлена, што гіганцкія ГЭС неэфэктыўныя і небясьпечныя для экалёгіі, але невялікія лакальныя гідраэлектрастанцыі здольныя забясьпечваць электраэнэргіяй значныя раёны.

Міністэрства энэргетыкі ЗША у свой час, апублікавала сьпіс 10 найбольш небясьпечных ядзерных рэактараў катэгорыі высокай рызыкі. Натуральна ўсе яны знаходзяцца на тэрыторыі Усходняй Эўропы і краінаў так званага СНД. У гэты пералік ўваходзяць: 1-шы і 2-гі блокі ЧАЭС (Украіна); 1-шы і 2-гі блокі Кольскай АЭС (Расея); энэргаблокі Ігналінскай АЭС (Летува); Багунічскай АЭС (Славакія); Казладуйская АЭС (Баўгарыя).

Вядомы скандал быў з паўночнакарэйскімі АЭС савецкай пабудовы, дзякуючы якім Паўночная Карэя атрымала магчымасьць мець ядзерныя зарады ўласнай вытворчасьці. Таксама ў сувязі з супрацоўніцтвам Расеі з Іранам у ядзернай галіне. Агульнавядома імкненьне таталітарных рэжымаў мець ядзерную зброю, дзеля чаго без існаваньня АЭС ніяк не абысьціся…

Мінулы пасьля Чарнобыльскай катастрофы час, быў скарыстаны апалагетамі ядзернай энэргетыкі (як заходнімі так і расейскімі) дзеля рэабілітацыі сындрому грамадзкай сьвядомасьці, што набыла пасьля атамнай аварыі „чарнобыльскі комплекс". У любой дзяржаве, а тым больш у таталітарных, існуюць групы людзей і адпаведныя арганізацыі, інтарэсы якіх уплываюць на прыняцьце важных у атамнай галіне рашэньняў. Яны, абапіраючыся на актуальнасьць пэўнага моманту, аргумэнтуюць неабходнасьць прыняцьця менавіта такіх рашэньняў, якія неабходныя для іх асабістага дабрабыту, і дзеля гэтага яны не спыняюцца ні перад чым. Зразумела таму, што вядомыя асобы – А. Сахараў, Р. Пасько (Расея), Ю. Бандажэўскі (Беларусь) якія асьвятлялі, непажаданыя для гэтых колаў адмоўныя бакі савецкай (расейскай) ядзернай энэргетыкі, у выніку вымушаны былі спазнаць рэпрэсіўныя ўзьдзеяньні пэўных ворганаў.

Апрацоўка грамадзкай думкі, асабліва ва ўмовах адсутнасьці дэмакратыі, дае свой дрэнны плён. Зьяўляецца хлусьня ў выглядзе вартай даверу інфармацыі пра адсутнасьць аварыяў на АЭС, ці ў крайнім выпадку пра іх нязначнасьць. Зноў, быццам бы не было і няма наступстваў ад аварыі ў Чарнобылі і ад ядзерных выпрабаваньняў. У 1945–1995 гг. было зьдзейсьняна 2057 ядзерных выбухаў, зь іх 1547 – падземныя і падводныя. Адмыслоўцы ад ядзернай галіны пераконваюць людзей у выключнай бясьпецы, адсутнасьці альтэрнатывы і эканамічнай выгадзе ад выкарыстаньня ядзернай энэргетыкі (АЭС). Нягледзячы на тое, што яшчэ ў 1980 г. былі спыненыя ядзерныя выбухі ў атмасфэры (туды трапляе 75% радыёізатопаў ад выбухаў), частка радыёактыўных рэчываў выпадае доўгі час, працягвае забруджваць глебавае покрыва і ваду плянэты. Вытворчасьць і выпрабаваньне ядзернай зброі, эксплуатацыя АЭС прывялі да выкіду ў атмасфэру вялізарнай колькасьці радыёнуклідаў.

„Атамныя бомбы, якія даюць электрычнасьць" так называюць расейскія (савецкія) АЭС за мяжой. Пасьля Чарнобыля ўжо адбыліся буйныя катастрофы, якія ўтойвалі ад грамадзкасьці. Аварыя на Кольскай АЭС у лютым 1993 г., прывяла да выкіду радыёактыўных газаў, у выніку выпраменьваньне, каля блока, павялічылася ў 20 разоў. Як адзначае чл.-кар. РАН Яблыкаў, толькі са студзеня 1992 па лістапад 1994, на АЭС Расеі і Летувы (Ігналінская АЭС) было больш за 380 аварыйных сытуацыяў, у тым ліку 5 сур'ёзных з выкідам радыёактыўных рэчываў. Адзначым, што Ленінградская АЭС ужо выпрацавала свой рэсурс, але працягвае працаваць далей.

Аналізуючы аварыі і катастрофы на Балакоўскай АЭС (Расея), дасьледчыкі адзначаюць вострую неабходнасьць утылізацыі забруджанага абсталяваньня. У недалёкім будучым адпрацаваныя ядзерныя блокі, сховішча радыёактыўных адыходаў будуць знаходзіцца на беразе Волгі і паблізу г. Балакова нявызначана доўгі час. Але надзвычай ненадзейна працуюць і нядаўна пабудаваныя расейскія АЭС. 7 лістапада 2003 г., пасьля спрацоўваньня аўтаматычнай абароны, быў адключаны энэргаблок самай новай расейскай АЭС – Валгадонскай (яе пусьцілі ў лютым 2001 г.). Пра збой атамшчыкі паведамілі толькі праз чатыры дні пасьля аварыі. Непланавае спыненьне рэактара Валгадонскай АЭС было ня першым і не апошнім за нядоўгі час працы новай станцыі.

Заўважым, што калі гаворка ідзе пра адносна надзейна працуючыя АЭС (не расейскай вытворчасьці), без частых аварыйных выкідаў, дык таксама існуюць даказаныя факты адмоўнага ўзьдзеяньня АЭС на чалавека. Так у штаце Масачусэтс, было выяўлена, што ў людзей, якія працуюць і жывуць у двадцацімілевай зоне АЭС „Пілігрым", каля Плімута, у чатыры разы вышэй захворваньне лейкеміяй, чым звычайна. Павялічаная колькасьць выпадкаў рака у зоне АЭС „Траян", штат Арэгон. У паселішчы, каля брытанскага ядзернага цэнтра ў Селафілдзе, захворваньне дзяцей лейкеміяй у 10 разоў вышэй чым па краіне.




(Фота Ю. Дарашкевіч)

*8. 2007 г. „За возрождение социализма". Дэманстрацыя камуністаў на плошчы Незалежнасьці ў Менску.*

Лабісты АЭС ідуць наўпрост на падман грамадзкасьці, калі параўноўваюць выкіды з вугальных электрастанцыяў з выкідамі на АЭС. Але на самой справе, яшчэ у 1977 годзе Навуковы камітэт ААН па праблемах ўзьдзеяньня радыяцыі паказаў, што на мегават атрыманай энэргіі, ўзьдзеяньне вугальных станцыяў у 375 разоў ніжэй за АЭС.

Забруджваньне радыяцыяй заўсёды спадарожнічае атамнай энэргетыцы – здабычы і перапрацоўцы ўрана, працы АЭС, захаваньню і рэгенерацыі паліва. У 1991 г. МАГАТЭ апублікавала рэестр, дзе былі дадзеныя актыўнасьці, каардынаты і глыбіня 47 месцаў знаходжаньня ў марскіх водах радыёактыўных адыходаў Нямеччыны, Вялікай Брытаніі, Новай Зеландыі, Італіі, Карэі, Нідэрляндаў, Францыі, Швайцарыі, Швэцыі і Японіі. Дадзеныя па СССР былі апублікаваныя ў 1993 г. У 1959-1992 гг. СССР (Расея) скідвалі ў паўночныя марскія воды вадкія і цьвёрдыя радыёактыўныя матарыялы.

У Намеччыне падлічылі, што захаваньне АЯП (адпрацаванага ядзернага паліва) значна таней за яго перапрацоўку і дазволяе сэкаоміць больш за 3 млрд. дал. Гэтым кіруюцца шатландскія і ангельскія АЭС. У Галяндыі ў 1993 г. парлямант вынес рашэньне пра неабходнасьць захоўваньня АЯП, а не перапрацоўкі. Вядома, што кошт захаваньня аднаго грама плутонія складае 15 даляраў (15млн. дал./т). Гэта маленькі прыклад, таго якіх грошаў каштуе захаваньне АЯП… Ідзе гаворка пра рэактары, дзе можна будзе спальваць плутоній, але пакуль іх няма. Адмыслоўцамі-ядзершчыкамі сьвядома замоўчваецца галоўная экалягічная небясьпека ад нармальна працуючых АЭС – забруджваньне біясфэры плутоніем. На зямной кулі было не больш за 50 кілаграмаў гэтага надзвычай таксічнага элемэнта да пачатку ягонай вытворчасьці чалавекам. Атамныя станцыі сьвету зараз напрадукавалі ўжо шмат сотняў тон плутонія. Каралеўскае навуковае таварыства паведаміла, што запасы збройнага плутонія

ў Вялікай Брытаніі дасягнулі 100 тон, гэтай колькасьці дастаткова каб вырабіць 17 тысяч атамных бомб, гаворыцца ў дакладзе. Брытанскі плутоній атрыманы галоўным чынам з адпрацаванага уранавага паліва, якое выкарыстоўвалася на АЭС. Варта адзначыць, што на нармальна працуючай АЭС, заўсёды прысутнічаюць выкіды радыёізатопаў інэртных газаў. Эколагамі даказана, што радыёізатопы інэртных газаў, якія раней лічыліся бясьпечнымі назапашваюцца ў клетках жывога. Назапашваюцца ў клетках радыёізатопы трытыя, вугляроду-14, амэрыцыя, плутонія, ёда-131 і іншых, што выклікае вядомыя наступствы для арганізмаў.

Працэсы, якія ідуць пры захаваньні АЯП далёка ня вывучаныя. Звычайна такія адыходы ўяўляюць сабой сумесь розных радыёактыўных і хімічных рэчываў. У кожным сховішчы непазьбежна ідуць свае працэсы, незалежна ці тое падземная выпрацоўка ці штучная ёмістасьць, ці вадаём… Пра гэта сьведчыць катастрофа на Паўднёвым Урале, у 1957 г., пра якую замоўчвалі да 90-х гадоў.

Як вядома, на тэрыторыі Аўстрыі няма ніводнай дзеючай АЭС. Мала таго, аўстрыякі нэгатыўна ставяцца да МАГАТЭ і патрабуюць ад мэра Вены, каб МАГАТЭ пакінула краіну. Гэта выклікана найперш дзейнасьцю МАГАТЭ якая лабіруе інтарэсы ядзерна-прамысловых комплексаў шэрагу краінаў у будаўніцтве ядзерных аб'ектаў (у прыватнасьці).

МАГАТЭ было ўтворана ў 1957 г. ААН. Але зараз агульнавядомая архаічнасьць гэтай арганізацыі, МАГАТЭ зацікаўлена ў распаўсюджваньні ТОЛЬКІ ядзерных тэхналёгіяў, нягледзячы на тое, што з разьвіцьцём навукі і тэхналёгіяў зьяўляюцца новыя, альтэрнатыўныя тэхналёгіі. Адышло ў былое тое, што было передавым у 50 гг., – быццам бы атамная энэргія нясе пазбаўленьне чалавецтву ад усіх бедаў і неабходна толькі сачыць за нераспаўсюджваньнем ядзернай зброі (праўда, намаганьні МАГАТЭ ў сувязі з гэтым, адносна Ірана, Паўночнай Карэі і некаторых іншых краін паказваюць няздольнасьць ці нежаданьне гэтай арганізацыі дасягнуць станоўчага выніку). Варта заўважыць, што статут МАГАТЭ скіраваны на распаўсюджваньне ядзерных тэхналёгіяў, а менавіта для гэтага МАГАТЭ і стваралася, таму ягоныя супрацоўнікі і ня могуць выступаць супраць свайго працадаўцы.

Адмоўная дзейнасьць МАГАТЭ праявілася пры ацэнцы наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Арганізаваныя МАГАТЭ камісіі паказвалі толькі адзін вынік – „нічога страшнага няма”. Гэта пры тым, што ў 90-гады ўжо існавалі дадзеныя, якія паказвалі адмоўнае ўздзеяньне радыяцыі (у тым ліку і малых дозаў) на чалавека, на рост захворваньняў і павелічэньне сьмяротнасьці на Беларусі, Украіне. Нічога не было сказана супраць экспэртамі МАГАТЭ, пра тое, што ўлады некалькі разоў „падымалі планку” афіцыйна дапушчальных узроўняў утрыманьня радыёнуклідаў у прадуктах харчаваньня чалавека. Варта ведаць, што нават выбар пляцоўкі пад будаўніцтва АЭС і далейшыя дзеяньні ў гэтым накірунку рэгламентуюцца нарматыўнымі актамі МАГАТЭ, але МАГАТЭ маўчыць ведаючы, што некаторыя таталітарныя рэжымы будуюць АЭС, альбо імкнуцца іх будаваць, дзеля завалоданьня ядзернай зброй і шантажа сусьветнай супольнасьці (што выдатна бачна на прыкладзе паводзінаў Паўночнай Карэі).

Абурэньне выклікаў, у прыватнасьці, даклад, які агучылі напярэдадні 20-годзя Чарнобыльскай катастрофы – гэта справаздача МАГАТЭ і Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ, альбо расейская абрэвіятура ВОЗ ), якая зьявілася напрыканцы 2005 г. Галоўная выснова: ніякіх сур'ёзных наступстваў для людзей пасьля Чарнобыльскай аварыі не чакаецца, будзе не больш за 4 000 летальных выпадкаў ад рака ў чарнобыльскім рэгіёне. Гэтая заява стала галоўнай прычынай стварэньня сур'ёзных альтэрнатыўных справаздачаў незалежных навукоўцаў. Найбольш поўныя даклады існуюць ад нямецкага аддзяленьня міжнароднай арганізацыі „Лекары за папярэджаньне ядзернай вайны” (Бон) і незалежных заходніх навукоўцаў пад эгідай дэпутатаў Эўрапарлямэнта.

Вывучыўшы справаздачу МАГАТЭ І СААЗ немецкія навукоўцы адзначылі – „МАГАТЭ І СААЗ у сваіх афіцыйных заявах маніпулююць уласнымі дадзенымі. Іх справаздача аб ўздзеяньні наступстваў Чарнобыля на здароўе людзей мае невялікія адносіны да рэальнасьці”. Незалежныя навукоўцы таксама адзначылі, што „Чарнобыльскі форум” МАГАТЭ і СААЗ не прыняў да ўвагі выснову Навуковага Камітэту ААН па ўзьдзеяньню атамнай радыяцыі пра тое, што ў сьвеце чакаецца ад 28 000 да 69 000 сьмерцяў ад рака і лейкеміі ў сувязі з Чарнобыльскай катастрофай. А калі падлічыць яшчэ і канцэрагенныя хваробы, дык гэтая лічба будзе яшчэ вышэй”. На Захадзе мала ведаюць каштоўныя дасьледваньні беларускіх навукоўцаў паколькі няма перакладаў на заходнія мовы. У бонскім дакладзе прыводзяцца дадзеныя, што больш за 90% ліквідатараў сталі інвалідамі. У Беларусі, па заключэньню групы навукоўцаў, больш за 10 000 чалавек захварэлі на рак у выніку Чарнобыльскай катастрофы. Нават СААЗ вымушаны быў прызнаць у сваіх матэр'ялах, што толькі на Гомельшчыне больш чым 50 000 дзяцей захварэюць ракам на працягу жыцьця.

У дакладзе „20 гадоў пасьля Чарнобыля: альтэрнатыўная справаздача” падрыхтаванай пад эгідай дэпутатаў Эўрапарлямэнта, зьвяртаецца ўвага на разыходжаньні дасьледваньняў незалежных навукоўцаў і МАГАТЭ-СААЗ. Адзначана, што 40% тэрыторыі Эўропы было забруджана цэзіям-137 вышэй, чым 4 кілобекерэлі на квадратны мэтр. Аўтары даклада адзначаюць „У дакладах МАГАТЭ-СААЗ увогуле не абмяркоўваюцца чарнобыльскія выпадзеньні ні ў якіх іншых краінах, апрача як на Беларусі, Украіне і Расеі…” Адзначаецца, што шмат у якіх краінах Эўропы былі ўжытыя меры па забароне спажываньня радыёактыўна забруджанай прадукцыі. Дзікі, ласі, а таксама грыбы, ягады, рыба ў пэўных раёнах Нямеччыны, Аўстрыі, Італіі, Швэцыі, Фінляндыі, Летувы і Польшчы ўсё яшчэ маюць высокі ўзровень радыёактыўнага забруджваньня.

Дзейнасьць МАГАТЭ і СААЗ сьведчаць пра палітызаванасьць згаданых арганізацыяў і іх змову з коламі ядзерна-прамысловых комплексаў пэўных краінаў у справе скажонай інфармаванасьці насельніцтва пацярпелых раёнаў, што выклікае агульны недавер да іх працы.

У чэрвені 2007 г. у сувязі са зваротам да МАГАТЭ беларускага боку, пачалася рэалізацыя дадатковага праэкта „Распрацоўка аптымальных шляхоў інтэграваньня АЭС у энэргетычную сістэму Беларусі” з бюджэтам у 49 тыс. дал. ЗША.

Улада на Беларусі, якая гвалтоўна ўтрымліваецца купкай стаўленікаў КГБ-шнай Расеі, – улада беларусафобаў (якая зь нянавісьцю, мэтанакіравана вынішчае ўсё беларускае – мову, літаратуру, школу, тэатар, гісторыю, эканоміку, ахову здароўя, нацыянальную бясьпеку, нацыянальныя адметнасьці) ўзялася за апошняе – канчатковае зьнішчэньне беларускага народа. Асоба, якая пры сваёй абсалютнай адукацыйнай і агульнакультурнай нікчэмнасьці, нянавісьці да ўсяго беларускага, супрацьпраўна займае вышэйшую пасаду на Беларусі, гэтая асоба выдала наступнае: „Гарантированно обеспечить Белоруссию более дешевой электроэнергией поможет строительство современной, надежной атомной электростанции. Ее возведение позволит снизить потребности государства в импортных энергоносителях почти на треть.” І гэта пры тым, што менавіта пры непасрэдным удзеле згаданай асобы, Беларусь была безальтэрнатыўна прывязана да палітыкі і эканомікі імпэрскай Расеі, да яе нафты і газу. Зараз яны хочуць, апрача ўсяго іншага, прывязаць Беларусь і ў атамнай галіне да гэбісцкай Расеі (пры ўсіх згаданых адмоўных акалічнасьцях атамнай энэргетыкі).

Улады, што незаконна кіруюць цяпер у Беларусі, сьвядома нічога ня робяць у патрэбным накірунку структурных пераўтварэньняў паліўна-энэргетычнага комплексу краіны. Яны нічога не кажуць пра катастрафічную энэргаёмістасьць беларускай прамысловасьці, пра існуючыя альтэрнатыўныя (ядзернай энэргетыцы) больш танныя і бясьпечныя крыніцы энэргіі, пра неабходнасьць сучаснага аналізу беларускага паліўна-энэргетычнага комплесу (з прыцягненьнем незалежных адмыслоўцаў з прамыслова-разьвітых краінаў) для прыняцьця адпаведных дзеяньняў па ягонаму пераўтварэньню ў перадавую галіну. Замест гэтага вырашана гігантскія сродкі накіраваць на катастрофу.

***Пабудова АЭС на Беларусі (заходняй ці расейскай вытворчасьці), ва ўмовах панаваньня прарасейскай улады, улады беларусафобаў прывядзе толькі да аднаго – да канчатковага зьнішчэньня беларускай нацыі і, адпаведна, – краіны.***

Авантурныя дзеяньні і выступы розных лабістаў ад атамнай энэргетыкі на Беларусі (не істотна, усходніх ці заходніх) з хлусьлівымі заявамі пра таннасьць электраэнэргіі атрыманай на АЭС, выклікаюць выключнае абурэньне, таму што не гаворыцца пра кошт ядзернага паліва (які няспынна падымаецца), не гаворыцца пра кошт утылізацыі адпрацаванай АЭС (які роўны яе будаўніцтву), не гаворыцца пра кошт захаваньня АЯП, не гаворыцца пра надзвычай-

ную ненадзейнасьць АЭС (асабліва расейскіх), не гаворыцца пра пагрозу якую нясе АЭС для ўсяго жывога на Беларусі, для Эўропы і ўсяго сьвету, што ёсьць злачынствам, якое нельга дапусьціць.

**Юрка Цехановіч**

# ДОЎГА НЕ ДЫСКУТАВАЛІ

28 лютага расейскія тэлеканалы паказалі „сапраўдную драму". Яны зноў „о русском языке". Гэтым разам ва Украіне. Паводле закону, на тэрыторыі дзяржавы ўся кінапрадукцыя павінна дэманстравацца на дзяржаўнай украінскай мове. Ва ўсходніх рэгіёнах і нават у Кіеве пачалі выступаць за русскость кінапракатчыкі (ва Украіне кінатэатры прыватныя). Каб паказаць гледачам „усю драму барбы", расейскае тэлебачаньне ўключыла ў рэпартаж архіўныя кадры. На сцэне за дубовым сталом сядзяць некалькі „русскоязычных" і выступаюць супраць украінскай мовы ў кінапракаце. Выступалі яны нядоўга. З глядзельнай залі на сцэну жвава выскачыла некалькі ўкраінскіх хлопцаў. Яны адным махам перакулілі стол разам з усёй праграмай русскосьці. Як бачым, маладое пакаленьне ўкраінцаў доўга не дыскутуе з русіфікатарамі...

***Янка Базыль***

# „ЗАЛІЎСЯ СЬЛЯЗЬМІ"

26 лютага 2008 г. Нарвэжская газэта „Aftenposten" пісала пра чарговы працэс над зьнішчальнікамі народу ў Камбоджы. Гэтым разам на лаве падсудных сумна вядомы Кайнг Гуэк Эў. Пры дыктатуры прамаскоўскіх „чырвоных кхмэраў" (1975-79) ён быў начальнікам турмы ў Пнам-Пэні. Пад ягоным кіраўніцтвам былі закатаваны і забіты 16 тысячаў патрыётаў. Газэта адзначае кур'ёзны факт. Канвойныя расказалі журналістам, што калі супэрката вадзілі па месцах злачынстваў і паказвалі кучы чарапоў ягоных ахвяраў, то ён некалькі разоў заліўся сьлязьмі.

Наш камэнтар: Такое бывае са злачынцамі. Пра гэта ёсьць сьведчаньні ў чалавечай гісторыі і ў Пісаньні. Такога, аднак, няма ў практыцы маскоўскіх забойцаў нашага народу. Ніхто і ніколі ня чуў іхнага прызнаньня віны, ня бачыў іхных сьлёз раскаяньня або нейкіх душэўных пакутаў. Яны (а таксама іхныя акупанцкія нашчадкі) прыходзяць у Курапаты, каб блюзьнерыць, зьдзяйсьняць акты вандалізму і правакацыі. Але яны павінны ведаць, што іх чакае лава падсудных і адэкватнае пакараньне.

***Алесь Хадасевіч***

# МАРНАВАНЬНЕ РОЗУМУ

Расейская вялікадзяржаўная прапаганда вось ужо скора 20 гадоў распаўсюджвае пра мяне ўсялякія ацэнкі і што папала – ад „фашыста" і „политического трупа" (успамінаецца О.Генры) да „ідэаліста" і „рамантыка" (гэта ўжо больш дамарослыя, мясцовыя). Адпаведна усё, што зрабіў „фашыст" і „труп" ёсьць дрэнна. Калі ж „ідэаліст" і „рамантык", – то тады не зрабіў нічога. У абодвух выпадках ва ўсім памыляўся і ва ўсім вінаваты. У гэтую дыфамацыйную шкалу ўблытваюцца розныя людзі.

Увогуле, мне здаецца, што мая сьціплая дзейнасьць у палітыцы характарызуецца практычнасьцю і мае якраз практычныя вынікі. Мяркую, што я прычыніўся і да Курапатаў, і да праўды пра Чарнобыль, і да арганізацыі БНФ, і да вяртаньня рэальнай незалежнасьці Беларусі, і да сымволікі, і інш., а палітычная арганізацыя, якую я ўзначальваю (Беларускі Народны Фронт), рэалізавала на практыцы гэтыя задачы і ажыцьцявіла прынцыпы, якія сталі нашымі нацыянальнымі дасягненьнямі.

Падкрэсьліваю, што мы дамагліся рэальнай незалежнасьці Беларусі з усімі інстытуцыямі незалежнай дзяржавы, а ня толькі дэкляратыўнай, як некалі ў БНР. Мы заклалі дзяржаўныя асновы нашай незалежнасьці. Таму ***дзень 25 жніўня 1991 года дзеля нашай гісторыі такі ж вялікі, як і 25 сакавіка 1918-га***, адкуль пачаўся адлік нашага дзяржаўнага адраджэньня.

Барацьба, якая вялася і вядзецца за нашае беларускае нацыянальнае адраджэньне з імпэрскай Расеяй – гэта барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць. Тут Масква прайграла нам (упершыню за 200 гадоў) у практычнай палітыцы, але значна адыгралася ў прапагандзе. Паскудны, ненавісны, фальшывы вобраз, створаны нам, адраджэнцам, (і мне асабіста) камуністычнай і потым імпэрскай расейскай прапагандай, фантастычны ў сваёй мярзотнасьці, хлусьні і пачварны па разбуральнай сіле.

Вынік прапагандысцкай вайны супраць асобаў Беларускага Адраджэньня (як і раней супраць асобаў БНР) – гэта рэзкая палярызацыя ўяўленьняў людзей, фактычна, раскол грамадзтва – агулам выказваюцца толькі крайнія ацэнкі. У гэтай непрадуктыўнай канфрантацыі часам плаваюць ахвяры прапаганды, што нібыта ўзвышаюць сябе над „палемікай", карыстаюцца прыдуманай тэрміналёгіяй і даюць квазінавуковыя заключэньні, прыніжаючы практычныя вынікі Беларускага Адраджэньня ледзь ні да літаратурных фантазіяў. (Што да мяне, то, магчыма, блытаюць палітычную рэальнасьць з маёй творчасьцю.) Прыдумалі мне фармулёвачку – „нявольнік гісторыі" (інтэлігентны эўфэмізм „політического трупа"). Заваёвы паказваюцца як паразы, дасягненьні – як правалы, посьпехі – як памылкі, дзеяньні – як бяздзейнасьць і г.д., па доктару Гёбэльсу.

Памятаецца 1990 год. У Вярхоўным Савеце на старшыню Камісіі па замежных справах Апазыцыя БНФ прапанавала дэпутата ад БНФ Пятра Садоўскага. Апанэнт ад камуністаў – ветэран НКВД – заявіў прыкладна наступнае: *выбираць нельзя. Товарищ Садовский хвастался, что знает пять иностранных языков. Но когда вся страна боролась за построение коммунизма, товарищ Садовский преследовал личные цели – сидел дома и изучал языки.*

Гэтага „ветэранам" хапіла, каб галасаваць супраць.

Справа ня ў глупстве (камуністы разумелі, што гэта ерунда) – справа ў парадыгме іхняе барацьбы з апанэнтамі. „Ветэраны" – людзі малапісьменныя, як умелі, так і гаварылі, але змагаліся па агульнай схеме. ***Цяпер галоўная мэта антыбеларускіх сіл – замоўчыць, і зьмяшаць з брудам усё тое, што было зроблена на пачатку 1990 х гадоў.***

Тым часам затоптваньне Беларускага Адраджэньня робіцца ня толькі па схеме. Бывае, гэта дзеецца людзьмі як бы і не варожымі, цалкам шчыра, ад няведаньня і нежаданьня больш ведаць. Калі ў пачатку 90-х адбывалася Беларуская нацыянальная рэвалюцыя, філёсаф Пётра Рудкоўскі, напрыклад (аўтар публікацыяў, які, падобна, спэцыялізуецца па ацэнцы маёй асобы і выказвае свае погляды на радыё „Свабода" (21.02.2008), быў яшчэ ў вельмі маладым школьным узросьце, каб нешта асэнсаваць. Потым антыбеларускі рэжым зглуміў, зьнішчыў і схаваў шмат што пра гэтыя вялікія пераломныя для беларусаў часы. Але ўсё ж пры жаданьні можна ведаць і шмат даведацца, нават жывучы сярод гэтага цёмнага цяперашняга ліхалецьця.

Відаць, такога жаданьня істотна не хапае. У выніку выплываюць нейкія дзіўныя фразы і сэнтэнцыі невядома пра што. Памятаю ў рэцэнзіі на маю кнігу *„Гутаркі з Антонам Шукелойцем"* Пётра Рудкоўскі напісаў нешта нават пра „псыхічную энэргію" майго „лібіда", дзякуючы якому, „Пазьняк перастаў адрозьніваць сваю душу ад калектыўнага суб'екту (Беларусі)" і ў выніку стаў „успрымаць самога сябе як «звышчалавека», а гэта прывяло да ўзросту прэтэнзіяў на адзіна праўдзівую інтэрпрэтацыю падзеяў, спарадзіла няздольнасьць да кампрамісаў і кааліцыяў, хранічную падазронасьць і інш." – увесь камуністычны прапагандысцкі набор у квазінавуковай упакоўцы. Прачытаеш такія „вумнасьці" і сам думаеш: а ці ўсё там у парадку зь іхным „лібіда"?

Тое ж і пра „сьлепату прынцыпалізму" (ну і слоўца прыляпілі!). Гэта на „Свабодзе".

Зрэшты, ніхто не гарантаваны ад кур'ёзаў. Але мяне нясьцярожвае выбарнасьць у падыходзе такіх людзей – выхапіць фразу, узяць напракат прапагандысцкі ярлычок, прыдумаць тэрміналёгію і філясофстваваць... філясофстваваць, любавацца разумнымі думкамі. Схаластыка, пры гэтым, аказваецца вельмі прыемным заняткам – навошта нешта рэальна ведаць, даведвацца пра фактаlёгію, вывучаць, несьці адказнасьць.

Сумна ўсьведамляць і бачыць гэтае марнаваньне розуму. Бо ў цяперашні цяжкі і разбуральны для нашага беларускага грамадзтва і нацыі час патрэбная была б якраз яе інтэлектуальная мабілізацыя дзеля абароны таго, што нішчаць найперш: мовы, культуры, гісторыі, людзей, усяго свайго. Мяркую, што ўсім нам, беларусам, трэба б было цяпер памятаць найперш пра нашу беларускую драму, пра небясьпеку для беларускай нацыі, пра выхад з цяжкай пары, пра будучыню нашай Айчыны.

*22 лютага 2008 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# БЕЛАРУСЫ Ў БІТВЕ ЗА НІДЭРЛЯНДЫ

6 траўня 2008 г. Нідэрляндская газэта „De Standaard" піша пра адзначэньне 63-х угодкаў вызваленьня Нідэрляндаў ад нямецкай акупацыі. У Амстэрдаме адбыўся вялікі канцэрт у парку пад адкрытым небам. Прысутнічала каралева і іншыя афіцыйныя асобы. Выконвалася сімфанічная музыка. Канцэрт завяршыўся выкананьнем амэрыканскай песьні „We'll meet again" („ Мы сустрэнемся зноў"). Ангельская сьпявачка Вера Лін выконвала гэтую песьню ў ЗША, калі тысячы амэрыканскіх жаўнераў адплывалі на вайну ў Эўропу.

Наш камэнтар: Вядома, што значная частка амэрыканскага грамадзтва і палітычных сілаў была супраць удзелу амэрыканскай арміі ў вайне на эўрапейскім тэатры дзеяньняў. Многія меркавалі, што трэба абмежавацца вайной супраць Японіі на Ціхім акіяне. Людзі лагічна даводзілі: „Эўрапейцы самы дагуляліся з Гітлерам, няхай сёрбаюць гэтую кашу самы. Чаму мы павінны падстаўляць сваіх хлопцаў пад кулі?.." Але прэзыдэнту Рузвэльту ўдалося даказаць, што трэба разам ратаваць Эўропу ад карычнявай чумы. Дзесяткі тысячаў маладых амэрыканцаў загінулі, вызваляючы Заходнюю Эўропу. Пра гэта памятаюць удзячныя народы.



*9. 1988 г. На першым мэмарыяльным мітынгу ў Курапатах.*

У бітве за Нідэрлянды беларускія жаўнеры і афіцэры змагаліся разам з мужнымі амэрыканцамі. Пасьля высадкі заходніх альянтаў у Нармандыі ў чэрвені 1944 г. на працягу трох месяцаў былі вызвалены большая частка тэрыторыі Францыі і Бэльгіі. Нямецкая армія распадалася і адступала. Брытанскі маршал Мантгомэры распрацаваў сьмелую, але рызыкоўную апэрацыю пад кодавай назвай „Маркэт-Гардэн". У рамках найбуйнейшай паветрана-дэсантнай апэрацыі ў гісторыі войнаў дэсантныя дывізіі павінны былі захапіць масты ў тыле ў немцаў на тэрыторыі Нідэрляндаў, а таксама паралізаваць баявыя парадкі ворага. А тым часам насустрач ім павінна была прабіцца ударная групоўка асноўных войскаў з боку Бэльгіі. У выніку Мантгомэры плянаваў праламіць фронт, захапіць Рурскую вобласьць Нямеччыны – апірышча нямецкай прамысловасьці – і скончыць вайну да Калядаў 1944 г.

17 верасьня 1944 г. сотні транспартных самалётаў засьцілі неба над Англіяй і Францыяй. Гулматораў у вышыні быў настолькі моцны, што давялося спыніць ранішнія багаслужбы ў касьцёлах. Брытанскія дэсантныя групы захапілі большасьць вызначаных аб'ектаў у нямецкім тыле. Але разьлік на поўную дэмаралізацыю і дэзарганізацыю ворага быў памылковы. Немцам удалося самаарганізавацца і пачаць лютыя контраатакі. У наступныя дні ў Нідэрляндах высаджваліся амэрыканскія парашутысты і жаўнеры 1-й Польскай паветрана-дэсантнай брыгады генэрала Сасабоўскага, у якой служылі сотні беларусаў. Юнакі і мужчыны з заходніх вобласьцяў Беларусі былі мабілізаваны ў Войска Польскае ў 1939 г., ваявалі супраць нямецкай інвазіі і адышлі з палякамі ў Францыю, а потым у Вялікую Брытанію. Другая частка беларусаў патрапіла на Захад у складзе польскай арміі генэрала Андэрса, вырваўшыся з Савецкага Саюза („нялюдскай зямлі", як казалі тады беларусы) у 1942 г. Бітва за Нідэрлянды была адным з найбольш драматычных эпізодаў іхнага змагарнага шляху. Калі тысячы парашутыстаў апускаліся на зямлю, „немцы стралялі па нас, як па курапатках…" – успаміналі беларускія вэтэраны. У баях у раёне гарадоў Эйндховэн, Нэймэгэн і Арнхэм 1-я брыгада вызначылася сьмеласьцю і рашучасьцю, але панесла цяжкія страты. Рызыкоўны плян Мантгомэры, аднак, праваліўся. Парашутысты мусілі адбіваць нямецкія танкавыя атакі, маючы толькі лёгкую зброю. Захлынуўся і галоўны англа-амэрыканскі прарыў па дарозе на Рур. Праз тыдзень баёў пачалося адступленьне паводле загаду хаўруснага камандваньня. Упершыню за ўсю вайну пашкуматаныя часткі атрымалі загад не эвакуіраваць з сабой параненых. Настолькі вялікай была пагроза поўнага атачэньня і зьнішчэньня аддзелаў. Канчатковае вызваленьне Нідэрляндаў адбылося толькі ў траўні 1945 г.

Ня трэба крыўдаваць на нідэрляндцаў, што яны ня выканалі на ўрачыстым канцэрце беларускай песьні ў памяць аб нашых героях. Дзякуй, што іхныя магілы добра дагледжаны культурным народам. Хвалюе іншае. На працягу дзесяцігоддзяў подзьвіг нашых дзядоў, якія змагаліся на Захадзе, быў брутальна выкрэсьлены з беларускай гісторыі, школьных падручнікаў і народнай памяці. Паводле савецкай дактрыны, іх там „проста не было". Тых вэтэранаў, якія вярнуліся ў падсавецкую Беларусь пасьля вайны (чатыры з паловай тысячы чалавек), НКВД арыштавала і выслала ў ГУЛАГ на працягу адной начы ў красавіку 1949 г. Да пачатку 1990-х гадоў іх афіцыйна не прызнавалі вэтэранамі вайны. Трэба вяртаць належнае ў нашу гісторыю і культуру. Пасьля краху антыбеларускага рэжыму на нашай зямлі і ў Заходняй Эўропе павінны паўстаць помнікі беларускім героям.

***Валеры Буйвал***

**З Ь М Е С Т**

1-2. Рэжым абвясьціў „выбары" . . . 2
3. Зянон Пазьняк. УЛАДА ЦЕМРЫ . . . 3
4. Шукаюць ахвотных падзарабіць на продажы Бацькаўшчыны . . . 5
5. Зянон Пазьняк. САКАВІК – 2008 . . . 5
6. Дзень Волі ў Віцебску . . . 7
7. Янка Базыль. Ня ўдасца пражыць, шукаючы шчыліны . . . 7
8. Сяргей Навумчык. Памяць Курапатаў . . . 7
9. Акт вандалізму ў Курапатах . . . 8
10. Крыжы ў Курапатах адноўлены . . . 8
11. Зянон Пазьняк. Народны мэмарыял Курапаты . . . 8
12. Янка Базыль. Травень на постсавецкай прасторы . . . 10
13. Чарговы факт вынішчэньня Беларусі . . . 10
14. Расправа рэжыму над беларускім школьнікам . . . 11
15. Спыніць хімічную атаку расейскай фірмы на Менск . . . 11
16. Юрка Цехановіч: „Любая АЭС для Беларусі – апошняя катастрофа" . . . 12
17. Янка Базыль. Доўга не дыскутавалі . . . 15
18. Алесь Хадасевіч. „Заліўся сьлязьмі" . . . 15
19. Зянон Пазьняк. МАРНАВАНЬНЕ РОЗУМУ . . . 15
20. Валеры Буйвал. Беларусы ў бітве за Нідэрлянды . . . 16

*Нумар аддрукаваны пры падтрымыцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**